Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 190
(26055)
Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «прамыя лініі»

УСЕ ХВАРОБЫ АД НЕРВАЎ

У вас бяссонніца? Прыгнечаны настрой? Незразумелыя страхі і фобіі? Адчуванне ўласнай непаўнацэннасці? Усе гэтыя станы абавязкова перадаюцца на адпаведныя рэцэптары і не праходзяць для арганізма бясследна. Як адаб'ецца такі дысбаланс на вашым здароўі, як можна пазбегнуць яго? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адкажа **галоўны псіхатэрапеўт рэспублікі, кандыдат медыцынскіх навук, загадчыца кафедры псіхатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірына Анатольеўна БАЙКОВА.**

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ» АДБУДЗЕЦЦА СЁННЯ з 14.00 да 15.30 па тэлефонах: 8(017) 292 38 21 і 292 38 92.

ПЕНСІЙНАЯ «РАСКЛАДКА»

Як і калі праводзіцца перараслік пенсій, хто мае права на надбаўкі і павышэнні, што чакае пенсіянераў-датэрміноўшчыкаў, якія змяненні могуць адбыцца ў пенсійным заканадаўстве, а таксама асаблівасці вылічэння стажу і заробку — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» «Звязды» з удзелам **начальніка Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» адбудзецца **10 кастрычніка з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8-017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Выбраўшы В. Папова старшынёй Палаты прадстаўнікоў, дэпутаты зрабілі аптымальны выбар»

Парламент Беларусі сумесна з органамі выканаўчай улады будзе працаваць над удасканаленнем сістэмы падрыхтоўкі законапраектаў усімі суб'ектамі заканадаўчай ініцыятывы. Адпаведнае пажаданне было выказана Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам на сустрэчы з нававыбраным Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вадзімам Паповым, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Віншуючы Вадзіма Папова з выбраннем на такую важную пасаду, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пункт гледжання дэпутацкага корпуса па гэтаму пытанню супаў з думкай Прэзідэнта. «Я лічу, што дэпутаты зрабілі правільны выбар, самы аптымальны для дзяржавы. Вы чалавек вопытны, вытрыманы, спакойны, без лішніх амбіцый. Ваша выбранне Старшынёй Палаты прадстаўнікоў — залог пераемнасці і стабільнасці», — сказаў Прэзідэнт.

«Галоўнае, каб парламент гэтага склікання спакойна завяршыў сваю работу, не дапусціўшы нейкіх усплёскаў эмоцый, што нагнятаюць абстаноўку ў грамадстве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт і спікер абмеркавалі пазіцыі развіцця і ўдасканалення адносінаў з парламентамі іншых дзяржаў і рознымі міжнароднымі структурамі.

На сустрэчы таксама была закранута тэма падрыхтоўкі бюджэтаў Беларусі і Саюзнай дзяржавы. Цяпер на разгляд Вышэйшага Дзяржаўнага Савета СД унесена кандыдатура Віктара Зубкова на пасаду кіраўніка Саюзнага ўрада. Пасля разгляду кандыдатуры адбудзецца пасяджэнне Саюзнага ўрада, на якім плануецца зацвердзіць саюзны бюджэт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў пажаданне своечасовага завяршэння работы над пакетам законапраектаў, што маюць перспектыўны характар. Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў мэтазгоднасць скарачэння да аднаго года тэрміну разгляду праектаў нарматыўных актаў у Нацыянальным сходзе. Гэтага патрабуе грамадства, эканоміка, а таксама міжнародная дзейнасць, у якой без прававога поля вельмі цяжка развіваць адносіны, адзначыў Прэзідэнт.

Прэзідэнт разгледзеў кадравыя пытанні

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 кастрычніка разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы назначыў:

МАРТЫНЕЦКАГА Канстанціна Аляксеевіча — Кіраўніком Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

ЛАБКОВІЧ Ларысы Пятроўны — намеснікам Міністра сувязі і інфарматызацыі;

СКАКУНА Валерыя Аляксеевіча — намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама;

АДАМЕНКІ Яўгена Буніслававіча — старшынёй Калінкавіцкага райвыканкама;

ЛІСА Анатоля Васільевіча — старшынёй Мазырскага райвыканкама;

ГАЛЬЦА Дзмітрыя Генрыхавіча — старшынёй Ваўкавыскага райвыканкама;

АКУЛІЧА Васіля Іванавіча — старшынёй Любанскага райвыканкама;

ІЛЬІНА Андрэя Анатольевіча — дырэктарам Дэпартамента інфарматызацыі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі;

ГАЛЬПЕРЫНА Аляксандра Леанідавіча — дырэктарам Дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў;

РЫНГА Уладзіміра Іосіфавіча — намеснікам начальніка Беларускай чыгункі;

ЦІМОШЫНА Сяргея Іванавіча — рэктарам установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога».

Прэзідэнт прыме ўдзел у самітах у Душанбе

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 5 кастрычніка накіруецца ў Душанбе (Таджыкістан), дзе прыме ўдзел у пасяджэннях Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, Міждзяржаўнага савета Еўразійскага эканамічнага супольніцтва і ў сесіі Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы, у парадак дня саміту лідараў краін Садружнасці ўключана каля 20 пытанняў. Галоўныя з іх — праекты Канцэпцыі далейшага развіцця СНД і Плана асноўных мерапрыемстваў па яе рэалізацыі, прапановы па ўзгодненай міграцыйнай палітыцы ўдзельнікаў СНД, Дагавора аб процідзеянні легалізацыі (адмыванню) злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму, а таксама шэраг праграм супрацоўніцтва ў сферы барацьбы са злачыннасцю і тэрарызмам.

ЗВЯЗДОЎСКІЯ ПРЫЗЫ — ВЕРНЫМ ПАДПІСЧЫКАМ

Учора ў сценах рэдакцыі прайшоў чарговы штоквартальны розыгрыш прызоў па выніках падпісной кампаніі на 4-ы квартал 2007 года.

Па добрай традыцыі вяршыцелямі лёсу нашых чытачоў, якія своечасова даслалі запоўненыя карткі ўдзельнікаў і спадзяваліся на ўдачу, сталі нашы падпісчыкі і супрацоўнікі паштовай сувязі. На гэты раз з лёгкай рукі работніка Мінскага электрамеханічнага завода Леаніда Кангатава, інжынера ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Наталлі Гуляевай і супрацоўніка Мінскага механічнага завода Ірыны Дуняк сваіх гаспадароў знайшлі каля трох дзесяткаў прызоў. Сярод іх — каляровы тэлевізар «Віцязь» і 2-камерны халадзільнік «Атлант». Падрабязнасці розыгрышу і спісы яго шчасліўчыкаў — у наступным нумары газеты.

З 20 верасня 2007 г. у аддзяленнях паштовай сувязі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта» адкрыта падпіска на газеты і часопісы Беларусі, Расіі і Украіны на першае паўгоддзе 2008 г.

Выкарыстанне электроннай тэхнікі дазваляе прадпрыемству афармляць падпіску на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі без папяровага падпіснога каталога, падаўжае падпіскі перыяд, паляпшае якасць абслугоўвання насельніцтва і дае магчымасць паважаным падпісчыкам аператыўна афармляць падпіску на любімыя выданні.

Выпісвайце і чытайце лепшае! Даверце дастаўку прэсы Нам!

РУП «Белпошта»

www.belpost.by

E-mail: orp@ belpost.by

ISSN 1990 - 763X

АЎТАМАБІЛЬНЫ РАМАН

13—14 кастрычніка «Звязда» плануе ўзяць удзел у аўтапрабегу рэтрааўтамабіляў па Брэсцкай вобласці. Ладзіць аўтапрабег Брэсцкі клуб аматараў рэтрааўтамабіляў «Адам». Такая назва ў гонар аўтамабіля «Опель-Супер-6» 1935 года выпуску (зарэгістраваны аўтамабіль як «Опель-Адам»), уладальнік якога Ігар СТУКАЛАЎ (на фота) з'яўляецца заснавальнікам і старшынёй клуба. Маршрут аўтапрабегу: Брэст—Кобрын—Бяроза—Пружаны—в. Вяжнае Камянецкага раёна—вёска Белая Камянецкага раёна—Нацыянальны парк «Белавежская пушча»—Камянец—Брэст. Мэты аўтамабільнага шоў — папулярызацыя рэтрааўтамабіляў, знаёмства з Брэстчынай турыстычнай і сустрэча з падпісчыкамі «Звязды», у тым ліку патэнцыйнымі. Напярэдадні падзеі «Звязда» вырашыла бліжэй пазнаёміцца з галоўным героем відовішча 72-гадовым «Адамам» (экіпаж якога складуць журналісты газеты) і яго ўладальнікам, а таксама даведацца пра ідэю і гісторыю стварэння клуба.

— Ігар, раскажыце, як вы сустрэліся са сваім «Опелем»?

— Калі мне было гадоў шэсць, каля аптэкі ў тым раёне Брэста, дзе мы жылі, стаяў аўтамабіль. Напэўна на ім прыязджаў на працу фармацэўт. Аўтамабіль быў вельмі незвычайны, такія можна было ўбачыць толькі ў кіно, і я ўвесь час каля яго круціўся. Ён быў для мяне як жывая істота, я з задавальненнем удыхаў яго пах, вітаўся з ім, у думках расказваў яму пра свае хлапечыя справы і «выслухоўваў» яго захапляльныя прыгодніцкія гісторыі. Адным словам, гэта было падобна на першае каханне.

Потым мы пераехалі ў іншы раён горада і нашы сустрэчы скончыліся. Паступова туга па сябру сцішылася, аднак заўсёды, нават стаўшы дарослым мужчынам, я, калі бачыў на вуліцы стары аўтамабіль, адчуваў у сэрцы глухое ныццё.

Недзе ў 1993 годзе на Брэсцкім аўтарынку я ўбачыў «Опель» 1935 года выпуску. Ён быў зялёны як кракадзіл. Як толькі на яго зірнуў, я зразумеў, што гэта той самы. Ну можа не дакладна той, што стаяў ля аптэкі ў 1975 годзе, але нейкі яго блізкі сваяк, усё астатняе было ўжо не важна. Але я тады так і не дачакаўся гаспадара машыны і пакінуў на лабавым шкле запіску, маўляў, куплю альбо памяняю. Гаспадар перазваніў праз месяц. Я прапанаваў яму абмяняць «Опель» на «Жыгулі» альбо прадаць. Ён сказаў, што падумае і... прапаў. З таго часу я толькі пра яго і думаў. Не ведаў, на жаль, адкуль гэты мужчына, ён сказаў толькі, што з Паўднёвага раёна, дык я гэты раён абышоў уздоўж і поперак, у кожны двор зазірнуў, пра кожны гараж распытаў. Безвынікова.

У 2001 годзе мне патэлефанаваў знаёмы музыкант і прапанаваў паглядзець нейкі стары аўтамабіль. Ён ведаў, што я да іх неабыякавы, а яму гараж трэба было вызваліць. Пытаюся, які аўтамабіль, а ён паціскае плячыма: стары, кажа, і ўсё. Я падумаў, што «Масквіч» нейкі. Але калі мы сталі падыходзіць да гаража, сэрца мае забілася гучней. І тут ён адкрывае дзверы і я бачу зялёны як кракадзіл «Опель». Той, які я так доўга шукаў. На некалькі імгненняў я згубіў пачуццё рэальнасці.

Аказалася, яго гаспадар памёр, а прывёў мяне зяць гаспадара. І стаяў «Опель» зусім не ў Паўднёвым раёне, у Паўднёвым жыў яго ўладальнік. Можаце сабе ўявіць, што я адчуў, калі яго зноў сустрэў. Але як толькі я падышоў бліжэй, я ўбачыў, што жалеза ператварылася амаль што ў паркаль. Гараж стаяў у сырым месцы, закрыты, вентыляцыі там не было — вільгаць і час з'елі палову аўтамабіля.

Я нават забраў яго не адразу пасля выплаты грошай. Напэўна, яшчэ месяц хадзіў туды кожны дзень і круціўся вакол аўтамабіля, не ведаючы, з чаго пачынаць. Да чаго не дакраніся, усё выпадала, высыпалася ці адвальвалася. У мяне нават узнікалі думкі яго... пахаваць.

Потым я набраўся духу і пачаў. І закончыў у 2005 годзе. Ахвяраваў дзеля яго шмат чым, давялося развітацца з неблагой калекцыяй старых гадзіннікаў, забыўся, як выглядаюць жонка і дачка... Дзякуй ім, што яны ўсё гэта вытрымалі і даравалі.

Сядзеў у падвале і разбіраў згнілыя драўляныя каркасы дзвярэй, перабіраў, аднаўляў... Адзін мой сябар, таксама аўтамабіліст, неяк паглядзеў на мяне, на машыну і даволі з'едліва заўважыў: «Ты з яго нічога не зробіш». Я неаднойчы ўжо чуў такое, але тут ён мяне зачапіў і мы паспрачаліся на бутэльку кефіру. Не скажу, што мне надта спатрэбіўся той кефір, але я тады цвёрда вырашыў, што абавязкова аўтамабіль адрэстаўрую.

Страшна ўзгадаць, колькі давялося зрабіць. Мне, вядома ж, дапамагалі. Маральна і фізічна. Без Алега Зашчука, Аляксандра Тарноўскага, Андрэя Зялёнага, Сяргея Галамазава я, напэўна, так да фінішу і не дайшоў бы. З каленяў мы паставілі аўтамабіль на калёсы. Яшчэ я ўвесь час уяўляў папярэдняга гаспадара, мне здавалася, што яму таксама было б не ўсё роўна: ажывае «Адам» альбо не. Ды і сам аўтамабіль прасіўся.

— Што вядома пра ранейшую яго гісторыю?

— У гады вайны ён быў падбіты на Раманаўскіх хутарах. Ляснік перацягнуў яго з поля бою да сябе ў хлеў. Неяк пра яго даведаўся вайсковец, які служыў пры штабе Першага Беларускага фронту. Гэта быў той самы ўладальнік, які так мне і не перазваніў у 93-м. Ён вярнуў аўтамабіль да жыцця. Дзеля гэтага давялося шмат чаго замяніць, у тым ліку і матор. Аўтамабіль жыў, працаваў і нават здымаўся ў фільме «Дачка камандзіра» і яшчэ некалькіх.

— Як «Адам» адчувае сябе сёння?

— Зараз ён герой не толькі Брэстчыны, але ўсёй Беларусі. Ён удзельнічаў у аўтапрабегу Брэст-Масква-Брэст у 2005 годзе, у IX міжнароднай выставе «Аўтаэкзотыка» ў Маскве, у сёлетняй выставе «Планета Жалязяка»... Назва маркі аўтамабіля «Опель-Супер-6», зарэгістраваны ён як «Опель-Адам», гэта вельмі рэдкая мадэль, і я магу паспрачацца, што тэхнічныя даныя яго падвесі і матора лепей за «Мерседэс» таго года.

Старых аўтамабіляў на Беларусі нямала, але шмат з іх стаіць у гаражах і хлявах, іх ніхто не бачыць, яны могуць быць у добрым стане, але стаяць на прыколе, бо ва ўладальнікаў альбо не хапае часу, альбо грошай, ці проста яны забытыя. Вось таму мы арганізавалі клуб аматараў рэтрааўтамабіляў, ладзім аўтапрабегі і выставы, каб разварушыць людзей, зацікавіць іх, падтрымаць тых, хто захоўвае вернасць... Стварылі свой сайт: www.adam.cityline.by

У нас ёсць «BMW-320» 1936 года, «Мерседэс V170» 1936 года, ёсць некаторыя амерыканскія мадэлі... Спадзяюся, мы «выцягнем» іх усіх у людзі, і яны паслужаць для ўпрыгажэння і каларыту горада. Мясцовыя ўлады, Брэсцкі аблвыканкам, гарвыканкам нас падтрымліваюць.

— Якія людзі прыходзяць у ваш клуб?

— Розныя. Але ва ўсіх, калі можна так выказацца, адна група крыві. Усе яны любяць панюхаць, паслухаць, памацаць аўтамабілі. Ёсць у нас бізнэсмен, урач, аўтаслесар, егер, школьнік... і нават дзяўчаты. Увогуле мы членства ў клубе ніяк не абмяжоўваем і хочам аб'яднаць усіх, хто адносіцца да аўтамабіля як да твора мастацтва. Не важна, якога ён года выпуску. Маскоўскія клубы абмяжоўваюць сваё членства 1970-м годам. Мы прымаем усіх.

На наступны год мы плануем наладзіць фестываль-аўтакурорт пад назвай «Планета Жалязяка». Збяром усіх энтузіястаў, раскінем палаткі, паставім самавары, дастанем пернікі...

— Якія прыгоды здараліся з «Адамам» падчас вандроўкі ў Маскву і назад?

— Калі расказаць пра ўсе, то аднаго інтэрв'ю будзе мала. Вось, напрыклад, адна. Калі мы пераехалі Смаленск, то ў нас патухла святло. Мы сталі на абочыну і вырашылі пераначаваць. Але заснуць так і не змаглі, бо літаральна кожны, хто праязджаў па дарозе, спыняўся, грукаў у шкло і прапаноўваў дапамогу. Спачатку было прыемна, потым дзіўна, потым смешна, потым не смешна, у рэшце рэшт заставалася толькі мірыцца.

Тое ж самае адбывалася і на дарозе. Ніводная машына не праязджала міма нас проста так, абавязкова прытармажвала, людзі фатаграфавалі «Адама» на сотавыя тэлефоны, сігналілі, махалі, нешта крычалі. Часам я проста баяўся, каб «Адам» не стаў прычынай ДТЗ.

Пры ўездзе ў Маскву мы трапілі ў затор, дык трэба было бачыць, з якой пяшчотай нам усе давалі дарогу, прапускалі наперад, паўцісканліся і як клапатліва крычалі «давай-давай, праходзь!» Дарэчы, за ўсю дарогу туды і назад не было, дзякуй Богу, ніводнага надзвычайнага здарэння, ніводнага праколу.

— А з «даішнікамі» як складаліся адносіны?

— Цудоўна. Яны спынялі, даддавалі чэсць і... прасілі іх сфатаграфаваць побач з аўтамабілем. Потым мы ўсім разаслалі карткі.

— Вашы родныя, якіх вы пакідалі дзеля выратавання «Адама», не зненавідзелі аўтамабіль?

— Думаю, яны яго палюбілі. Мая дачка вельмі любіць. Яго і мяне. Жонка — не ведаю, не пытаўся. Мне здаецца, з некаторага часу імя «Адам» у яе выклікае больш эмоцый, чым «Ігар»...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Па чутках і кампетэнтна

«МАЛОЧНАГА» ДЭФІЦЫТУ НЕ БУДЗЕ?

У асобных СМІ з'явілася інфармацыя наконт таго, што перапрацоўчыя прадпрыемствы сутыкнуліся з недахопам сыравіны. Таму, маўляў, у гандлёвай сеткі магчымыя перабоі з забеспячэннем малочнай прадукцыяй. Як заўважаюць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, аб'ёмы вытворчасці малака ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года павялічыліся. Сыравіны дастаткова для таго, каб забяспечыць загрузку прадпрыемстваў перапрацоўкі і «закрыць» патрэбу ўнутранага рынку, сцвярджаюць спецыялісты Мінсельгасхарча.

Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» выконваючы абавязкі дырэктара «Мінаблмясамалгандлю» Сяргей Цімчук, сітуацыя з забеспячэннем айчынных спажыўцоў малочнай прадукцыяй знаходзіцца пад пільным кантролем. Пастаўкі на экспарт адбываюцца, але ніколькі не ва ўрон унутранаму рынку. Таму дэфіцыту ўзнікнуць не павінна.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

10-РУБЛЁЎКІ ЗАСТАЮЦЦА!

У пачатку года ў беларускіх СМІ з'явілася інфармацыя аб хуткім выводзе з абарачэння 10-рублёвых банкнот Нацыянальнага банка з-за неадпаведнасці рэчаіснасці малюнка на купюры, дзе намаляваны стары будынак Нацыянальнай бібліятэкі. Прайшло ўжо даволі шмат часу, але банкноты так і не выведзеныя з абарачэння. Па растлумачэнні карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да начальніка ўпраўлення інфармацыі Нацбанка Анатоля Драздова, на словы якога тады і спасылалася большасць журналістаў у сваіх матэрыялах.

— Я ад вас упершыню чую гэтую інфармацыю. Такое пытанне ў планах не стаіць. У найбліжэйшы час 10-рублёвыя банкноты не будуць выведзеныя з абарачэння. Па-першае, вывад купюр з абарачэння — даволі працяглая працэдура, якая патрабуе ўзгаднення не толькі з Міністэрствам эканомікі, але і з урадам. Па-другое, давядзецца акругляць усе кошты да 20 рублёў. А ў гэтым зараз няма патрэбы. Па-трэцяе, калі і будуць выведзеныя з абарачэння 10-рублёвыя банкноты, то не па прычыне неадпаведнасці рэчаіснасці малюнка. Уявіце, што будзе, калі мы станем выводзіць з абарачэння ўсе купюры толькі з-за таго, што памяняўся знешні выгляд будынка, намаляванага на банкноце. Вазьміце, да прыкладу, 20-тысячную купюру, на якой можна ўбачыць віцебскі Летні амфітэатр такім, якім ён быў яшчэ да пачатку рэканструкцыі. І што нам зараз рабіць: таксама выводзіць з абарачэння? Грошы ў такім выпадку атрымаюцца залатымі не толькі ў пераносным, але і ў прамым сэнсе...

Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ХАБАР НА КРЫВІ

Чыноўнік Міністэрства аховы здароўя Беларусі разам з жонкай арганізаваў «карупцыйную суполку».

Як паведаміла оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС краіны Вераніка Пасмецьева, гэтая «карупцыйная гісторыя» пачалася з таго, што адна камерцыйная сталічная фірма закупіла ў Францыі і ўвезла ў Беларусь гематалагічныя аналізатары клетак крыві. Для рэгістрацыі медыцынскай тэхнікі і ўвогуле выкарыстання яе па прызначэнні неабходна было правесці шэраг экспертыз. Паскорыць гэты працэс камерсантам прапанаваў кансультант адмысловага аддзела Міністэрства аховы здароўя. Чыноўнік уцягнуў у крымінальную справу сваю жонку, якая займала адказную пасаду ў фірме, што праводзіла экспертызу медыцынскай тэхнікі. За свае паслугі карумпаваная пара запатрабавала 10 тыс. долараў. Пры атрыманні хабару сужэнцаў схапілі за руку супрацоўнікі службы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВЫДАЧА ВІЗ ПА НОВЫХ УМОВАХ ПЕРАНЕСЕНА

Днямі ў Варшаве завяршыліся беларуска-польскія кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў па консульскіх пытаннях.

Па прапанове беларускага боку дасягнута дамоўленасць аб пераносе польскім бокам на 1 снежня 2007 года прымянення новых умоў выдачы віз у польскіх консульскіх установах у Беларусі. Дадаткова польскі бок выказаў гатоўнасць не павышаць тарыф консульскіх збораў за выдачу віз, якія будуць дзейнічаць да 31 снежня 2007 года.

Беларускія дыпламаты выказалі заклапочанасць аднабаковым рашэннем Польшчы дэнансаваць з 1 студзеня 2008 года дзеючае Пагадненне аб узаемных паездках грамадзян. Тым не менш у выніку праведзеных перагавораў бакі дамовіліся заключыць пагадненне, якое рэгулюе ўзаемныя паездкі грамадзян да канца 2007 года. Плануецца, што ў абноўленым пагадненні ў максімальна дапушчальнай Шэнгенскімі правіламі ступені будуць захаваныя льготы, спрошчаныя ўмовы і працэдура атрымання віз для асобных катэгорый грамадзян. Беларусь прапанавала афармляць шматразовыя візы ў спрошчаным парадку беларускім і польскім грамадзянам ва ўзросце да 16 гадоў, старэйшым за 65 гадоў, інвалідам. Было таксама дасягнута пагадненне аб неабходнасці захавання практыкі выдачы віз неадкладна і без аплаты ў сувязі з цяжкай хваробай альбо смерцю родных і членаў сям'і.

Увага польскага боку была звернута на неабходнасць вырашэння праблемы складанай працэдуры атрымання польскіх віз і шматлікіх чэргаў каля польскіх консульскіх устаноў у Беларусі. Польскі бок запэўніў, што прыме неабходныя захады і разгледзіць магчымасць падаўжэння гадзін працы консульскіх устаноў у Беларусі. Падчас кансультацый беларускія дыпламаты ініцыявалі абмеркаванне магчымасці заключэння пагаднення аб спрошчаным перасячэнні мяжы прыгранічным насельніцтвам.

Леанід ТУГАРЫН.

РАБАЎНІКІ НАПАЛІ НА ЛІВАНЦА

Узброеныя пнеўматычным пісталетам крымінальнікі на тэрыторыі рынку напалі на іншаземца і завалодалі буйной сумай грошай.

Пад вечар у сераду «пад раздачу» трапіў грамадзянін Лівана, індывідуальны прадпрымальнік, які мае пасведчанне на права жыхарства ў нашай рэспубліцы і жыве ў Пухавіцкім раёне. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, на тэрыторыі гандлёвага рынку «Ждановічы» на прадпрымальніка напалі двое беспрацоўных — 27-гадовы жыхар Асіповічаў і 25-гадовы вясковец з гэтага ж раёна. Раней асуджаныя за крадзяжы злачынцы на гэты раз выйшлі на «справу» з пісталетам: пагражаючы зброяй ліванцу, яны забралі ў яго 20 мільёнаў 530 рублёў выручкі. Знікнуць жа з месца здарэння нахабнікі паспрабавалі на аўтамабілі «БМВ-Х5» пацярпелага. Аднак на дапамогу прадпрымальніку прыйшлі праваахоўнікі, якія і затрымалі рабаўнікоў. Абодва крымінальнікі змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Ігар ГРЫШЫН.

ДЫРЭКТАР КАЛЕДЖА ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ХАБАРНІЦТВЕ

У Гродне супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй быў затрыманы 49-гадовы дырэктар Гродзенскага гандлёвага каледжа.

Паводле папярэдняй інфармацыі, падазраецца гэты кіраўнік у хабарніцтве. У прыватнасці, у атрыманні трох тысяч еўра ад індывідуальнага прадпрымальніка за прадаўжэнне дагавора арэнды памяшкання, якое належыць навучальнай установе. На падставе гэтага факта ўзбуджана крымінальная справа, а следства высвятляе, ці адзінкавы гэта выпадак падобнай «прадпрымальніцкай» дзейнасці кіраўніка.

Ігар ГРЫШЫН.

БУДЗЕ ДАЖДЖЛІВА І ХОЛАДНА

У бліжэйшыя дні Беларусь будзе знаходзіцца пад уплывам цыклону паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

У пятніцу, 5 кастрычніка, на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—9 градусаў, на тарфяніках месцамі чакаюцца слабыя замаразкі — ад нуля да мінус 1 градуса. Удзень будзе ад 10 да 16 градусаў вышэй за нуль.

У суботу, 6 кастрычніка, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 4 да 10 градусаў цяпла. Удзень — 9—15 градусаў вышэй за нуль. У пачатку наступнага тыдня тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 градусаў, на тарфяніках — слабыя замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. Удзень стане на 2—3 градусы халадней і тэмпература паветра не перавысіць 6—13 градусаў цяпла.

ЮШЧАНКА ЎНЁС СМУТУ Ў ШЭРАГІ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка, які ў сераду прапанаваў Блоку Юліі Цімашэнкі, Партыі рэгіёнаў і Блоку «Наша Украіна — Народная самаабарона» распачаць кансультацыі па фарміраванні парламента і ўрада, выклікаў здзіўленне ў многіх палітыкаў і журналістаў. Такую заяву многія расцанілі як заклік да стварэння шырокай кааліцыі.

Аднак ёсць і іншы пункт погляду — гутарка вядзецца пра тонкую гульню прэзідэнта. Як кіраўнік дзяржавы Юшчанка не павінен выказваць сімпатыі якой-небудзь адной палітычнай сіле, каб не раскалоць грамадства. Таму адкрыта і не даручыў сфарміраваць урад Цімашэнцы. Адбыўшы з візітам у Германію, Юшчанка ўдакладніў сваю пазіцыю: так, для фарміравання дэмакратычнай кааліцыі дастаткова галасоў, але гэта не вырашыць пытанне стабільнасці ў дзяржаве. Праўда, тыдзень таму прэзідэнт выказваў зусім іншы пасыл: «У нас толькі адзін варыянт — фарміраванне дэмакратычнай кааліцыі. Іншай кааліцыі не будзе».

Новая пазіцыя Юшчанкі надала аптымізму Партыі рэгіёнаў, а вось Юлія Цімашэнка наадрэз адмовілася стварацца з імі кааліцыю. Больш за тое, калі гэта зробіць прэзідэнцкі Блок «Наша Украіна — Народная самаабарона», БЮЦ зноў сыдзе ў апазіцыю.

ЛІДАРЫ ДЗВЮХ КАРЭЙ ПАДПІСАЛІ ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ МІРЫ

Міжкарэйскі саміт завяршыўся падпісаннем маштабнага дакумента — міжкарэйскай Дэкларацыі аб міры. У ім утрымліваецца заклік да забеспячэння міру паміж дзвюма Карэямі і «сумеснага працвітання».

Кім Чэн Ір і Но Му Хен дамовіліся ствараць у Жоўтым моры спецыяльную зону міру, каб разам лавіць агульную рыбу, адкрыць авіяцыйную сувязь паміж Сеулам і паўночнакарэйскім раёнам на мяжы з Кітаем, а таксама аднавіць чыгуначныя перавозкі.

Усяго ў дэкларацыі восем пунктаў. Лідары дзвюх дзяржаў таксама пацвердзілі намер згарнуць ядзерную праграму КНДР. Нагадаем, у сераду Паўночная Карэя абавязалася поўнасцю рассакрэціць і вывесці са строю свае ядзерныя аб'екты да 31 снежня 2007 года.

Трохдзённы саміт, які стаў першай за сем гадоў афіцыйнай сустрэчай кіраўніка КНДР і прэзідэнта Паўднёвай Карэі, завяршыўся прыёмам у рэзідэнцыі Кім Чэн Іра. Фармальна краіны знаходзяцца ў стане вайны. Для аднаўлення адносінаў мірны дагавор павінны падпісаць не толькі Сеул і Пхеньян, але і прадстаўнікі ЗША і Кітая.

РАСІЙСКІМ УРАЧАМ ДАЗВОЛЯЦЬ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ НАД ДЗЕЦЬМІ?

У Расіі маюць намер дазволіць выпрабаванні лекаў на дзецях: у Расздраўнаглядзе створана рабочая група, якая павінна распрацаваць адпаведныя папраўкі ў Закон «Аб лекавых сродках».

На думку кіраўніка аддзела дзяржаўнага кантролю даклінічных і клінічных даследаванняў лекавых сродкаў Расздраўнагляду Сяргея Філюніна, даследаванні з удзелам дарослых не могуць даць аб'ектыўнай інфармацыі аб эфектыўнасці прэпарата ці аб яго ж пабочных дзеяннях на дзіцячы арганізм. У той жа час абаронцы правоў пацыентаў лічаць, што варта заканадаўча замацаваць і адказнасць медыкаў за вынікі фармакалагічных эксперыментаў над дзецьмі.

Дазваляючы выпрабаванне лекаў на дзецях, чыноўнікі маюць намер прывесці расійскае заканадаўства ў адпаведнасць з еўрапейскім, дзе выпрабаванні лекаў на непаўналетніх дазволены з гэтага года.

ПОБАЧ З КРАМЛЁМ ЗНОЙДЗЕНЫ 34 ТРУПЫ

У цэнтры Масквы падчас рэканструкцыі «Шарамецьеўскага падвор'я» ў падвале дома 8 па Нікольскай вуліцы знойдзены рэшткі 34 чалавечых целаў. Там жа быў знойдзены пісталет неўстаноўленага ўзору.

Паводле інфармацыі сталічнага ГУУС, пахаванне належыць да першай паловы мінулага стагоддзя — згодна з папярэднімі высновамі спецыялістаў, людзі забіты ў 1930-я гады. У ГУУС таксама адзначылі, што, магчыма, целаў у гэтым месцы значна больш. Пры абследаванні трупаў міліцыянерамі былі выяўлены агнястрэльныя раненні ў чарапах. Стрэлы былі зроблены з блізкай адлегласці. Такія раненні і размяшчэнне целаў дазваляюць выказаць меркаванне, што знойдзены расстрэльны пакой.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.10.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 149,00
1 еўра	3 029,34
1 латвійскі лат	4 309,64
1 літоўскі літ	877,38
1 чэшская крона	109,83
1 польскі злоты	802,63
1 расійскі рубель	85,92
1 украінская грыўня	425,42

*Курсы замеж

На падтрымку культуры і мастацтва з фонду Прэзідэнта Беларусі выдзелена больш за Br660 млн

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара, на фінансаванне расходаў фонду выдзелена Br660,714 млн.

За кошт сродкаў фонду Міністэрствам культуры будуць набыты творы жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вядучых беларускіх мастакоў для папаўнення калекцый Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Музея сучаснага выяўленчага мастацтва, Ганцавіцкага раённага краязнаўчага музея, Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка і іншых музейных устаноў рэспублікі.

Частка сродкаў пойдзе на выданне альбомаў і каталогаў, прысвечаных творчасці вядомых дзеячаў беларускага мастацтва: Героя Беларусі, народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага, народнага артыста Беларусі Уладзіміра Гасцюхіна, народнага мастака Беларусі Барыса Герлавана, народнага майстра, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва Мікалая Тарасюка, а таксама калекцыям Нацыянальнага мастацкага музея, Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Грашовыя сродкі выдзелены і на пастаноўку спектакляў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы, Рэспубліканскім тэатрам беларускай драматургіі, Брэсцкім тэатрам лялек, Гомельскім абласным драматычным тэатрам, Магілёўскім абласным драматычным тэатрам, народным тэатрам Шумілінскага гарадскога Дома культуры. Прафінансавана будзе пастаноўка новых канцэртных праграм Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам Беларусі імя І. Жыновіча, Беларускім дзяржаўным заслужаным харэаграфічным ансамблем «Харошкі».

Прынятае рашэнне будзе садзейнічаць папулярызацыі нацыянальнай культуры, дапаможа папоўніць рэпертуары вядучых і рэгіянальных калектываў рэспублікі новымі музычнымі, драматургічнымі і харэаграфічнымі творамі, адзначылі ў прэс-службе.

Літва гатова інвеставаць у эканоміку Беларусі амаль $1 млрд

Адпаведная дамоўленасць дасягнута ў Вільнюсе на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага з прэм'ер-міністрам Літвы Гедымінасам Кіркіласам.

Бакі дамовіліся пабудаваць у Беларусі завод па вытворчасці фармальдэгідных смолаў. У дрэваапрацоўчай прамысловасці гэта галоўны складальнік у вытворчасці ДСП і іншых матэрыялаў. Плануецца пабудаваць завод па вытворчасці ДСП.

Літва на ўрадавым узроўні практычна завяршыла вырашэнне пытання будаўніцтва ў сваёй краіне АЭС да 2015 года. Беларусь прэзентавала свой будучы праект у атамнай энергетыцы. Паводле слоў Сяргея Сідорскага, дасягнута разуменне таго, што сумесны з Латвіяй, Эстоніяй і Польшчай праект Літва плануе рэалізаваць у непасрэднай блізкасці ад граніцы з Беларуссю.

Беларусь са свайго боку зрабіла адпаведныя тлумачэнні, што фактычна за кошт водных рэсурсаў Віцебскай вобласці будзе абслугоўвацца гэта станцыя. Таму Беларусь сёння гаворыць аб тым, што ўдзел у літоўскім праекце беларускага боку таксама мае права на жыццё. «Я прасіў літоўскі ўрад гэта ўлічваць і знайшоў тут разуменне», — паведаміў Сяргей Сідорскі.

Ігналінская АЭС у 2009 годзе будзе закрыта. Што датычыцца сховішча, то раней Беларусь і Літва дамовіліся аб стварэнні рабочай групы па гэтым пытанні. Выказаны меркаванні наконт будаўніцтва гэтага сховішча побач з беларускай граніцай. «Тут Беларусь вырашае пытанні забеспячэння экалагічнай бяспекі краіны. Эксперты рабочай групы сцвярджаюць, што прымаюцца ўсе неабходныя меры па забеспячэнню такой бяспекі. Літоўскі бок запэўніў, што работа гэтай групы будзе прадоўжана ў дзеючым складзе», — канстатаваў беларускі прэм'ер.

Пасля будаўніцтва ў Літве новай АЭС для транзіту электраэнергіі ў краіны ЕС будзе выгадна выкарыстоўваць існуючыя сеткі беларускай энергасістэмы. Гэта будзе больш выгадна ў параўнанні з будаўніцтвам уласных сетак, якія могуць каштаваць $300—500 млн.

Прыкладна 5 млн тон беларускіх грузаў перавезена праз літоўскія парты. У літоўскіх калег ёсць зацікаўленасць, каб Беларусь максімальна выкарыстоўвала Клайпедскі порт. З удзелам Канфедэрацыі прамыслоўцаў Літвы і ўладальніка порта абмеркаваны магчымасці набыцця Беларуссю пакета акцый, выхаду на тэрмінал.

Бакі таксама дамовіліся аб тым, што ў лістападзе пройдзе канферэнцыя з прадстаўнікамі транспартных ведамстваў краін, асацыяцыяй перавозчыкаў Беларусі, мытнымі органамі.

Што датычыцца візавага рэжыму пасля ўваходжання Літвы ў Шэнгенскую зону, у выніку чаго кошт візы будзе павышаны да 60 еўра, абмяркоўвалася магчымасць льготнага перасячэння граніц. Дасягнута дамоўленасць аб тым, што будуць устаноўлены льготы для шэрагу катэгорый грамадзян Беларусі. Гэта датычыцца дзяцей да 18 гадоў, тых, хто едзе на аздараўленне, інвалідаў, якія пацярпелі ад Чарнобыля, а таксама людзей, якія пражываюць у пагранічных зонах і маюць сваяцкія сувязі. Для іх кошт візы застанецца на ранейшым узроўні.

Справы аб спагнанні запазычанасцяў па аплаце за паслугі ЖКГ будуць разглядацца ў спрошчаным парадку

На ўчарашнім пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дэпутаты ўхвалілі ў першым чытанні праект Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь па пытаннях удасканалення загаднай і выканальніцкай вытворчасці».

Дакумент прадугледжвае ўвядзенне спрошчанай працэдуры вытворчасці па справах аб спагнанні запазычанасці па аплаце за карыстанне жылымі памяшканнямі, тэхнічнае абслугоўванне і паслугі ЖКГ, па адлічэннях сродкаў на капітальны рамонт жылых дамоў. Гэтыя справы будуць разглядацца ў парадку загаднай вытворчасці — без правядзення судовага пасяджэння і выкліку бакоў. Сёння ж справы разглядаюцца ў парадку іскавай вытворчасці. Таксама законапраект прадугледжвае разгляд у загадным парадку спраў аб спагнанні запазычанасці за спажыванне цеплавой энергіі і тэлекамунікацыйныя паслугі.

Памер магчымага ўтрымання сродкаў з заработнай платы і даходаў, якія прыраўняныя да яе, будзе складаць да 50 працэнтаў.

Як адзначыў у гутарцы з журналістамі ў Доме ўрада міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў, які прадстаўляў законапраект, урад краіны не плануе павышаць тарыфы на паслугі ЖКГ з пачаткам ацяпляльнага сезону. У той жа час, паведаміў міністр, урад «працуе над заканадаўствам» аб павышэнні тарыфаў, якое можа адбыцца з пачатку наступнага года. У дакументе плануецца вызначыць механізм павышэння тарыфаў з улікам росту зарплаты і пенсій у краіне, узроўню інфляцыі.

Уладзімір Белахвостаў дадаў таксама, што кожны год тарыфы на камунальныя паслугі ў Беларусі будуць павышацца на 5—6 працэнтаў. Такое павышэнне тарыфаў не дапаможа арганізацыям ЖКГ выйсці на самаакупнасць у бліжэйшы час.

На ўчарашнім пасяджэнні дэпутаты таксама ўхвалілі ў першым чытанні праект Закона «Аб унясенні змяненняў ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў».

Дакумент прадугледжвае, што выдаткі на аплату за карыстанне жылымі памяшканнямі, тэхнічнае абслугоўванне, аплату камунальных паслуг (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электра- і цеплаэнергія, карыстанне ліфтамі, вываз і абяшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў), кошту цвёрдых відаў паліва (тым, хто жыве ў дамах без цэнтралізаванай падачы цеплаэнергіі), звязаныя з утрыманнем дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у дзіцячых дамах сямейнага тыпу, прыёмных і апякунскіх сем'ях «падлягаюць пакрыццю грамадзянам, на выхаванні якіх яны знаходзяцца, за кошт мясцовых бюджэтаў».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

КАШТОЎНЫЯ КАМЯНІ НАРАСХВАТ...

За 9 месяцаў у Беларусі прададзена 1000 атэставаных брыльянтаў — больш, чым за ўвесь мінулы год і снежань пазамінулага.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, на пачатак года насельніцтву было прададзена 917 каштоўных камянёў, а выручка за іх складала 686 млн рублёў. Што ж датычыцца апошніх даных, то на 1 кастрычніка прададзена ўжо 1917 брыльянтаў агульнай масай 335,46 карата. За гэтыя камяні было атрымана больш за 1 млрд 225 млн рублёў выручкі, што ў доларавым эквіваленце — 585 тысяч. Толькі за верасень на куплю атэставаных брыльянтаў насельніцтва патраціла каля 50 тысяч долараў, выкупіўшы 162 брыльянты. Учора ў касах Галоўнага ўпраўлення па Мінску і Мінскай вобласці Нацыянальнага банка можна было набыць брыльянт масай 0,1 карата за 116 долараў. Праўда, для больш сур'ёзных пакупнікоў прапаноўваліся і каменьчыкі, кошт якіх даходзіць да 16 461 долара за штуку.

За студзень—верасень насельніцтвам набыта 487,14 кілаграма залатых мерных зліткаў. Лідарства, як заўсёды, тут за зліткамі вагой 10 грамаў, якіх людзьмі набыта 6114 штук (усяго прададзена за дзевяць месяцаў 24 129 штук залатых мерных зліткаў). Аднаграмовы злітак, дарэчы, каштуе зараз 68 тыс. 770 рублёў. Што ўжо і казаць пра 1-кілаграмовы, кошт якога крыху большы за 54 мільёны рублёў. Тым не менш за студзень—верасень у рэспубліцы было прададзена 83 аднакілаграмовыя зліткі. Дададзім, што за згаданы перыяд насельніцтвам таксама было набыта 348 плацінавых зліткаў агульным аб'ёмам каля 5,97 кілограма (цана пяцідзесяцімоўнага — 541 тыс. 550 рублёў) і 3966 сярэбраных аб'ёмам 305,28 кілаграма (10-грамовы «заважвае» на 21 тыс. 490 рублёў).

Ці заробіш на грыбах і яблыках?

Паводле слоў загадчыка лабараторыі мікалогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі імя Купрэвіча Вольгі ГАПЕЕНКІ, прычына недароду грыбоў відавочная: сухое надвор'е. Зараз найбольшы шанц знайсці грыбы толькі ў моцна паніжаных, забалочаных мясцінах. Нават калі б прайшлі дажджы, для грыбніцы патрэбна не менш за 10 дзён, каб яна «адрэагавала» дарамі лесу. Прычым і надвор'е павінна быць адпаведным. Дык ці будзем мы з восеньскімі грыбамі? Усё залежыць ад далейшых умоў надвор'я, кажа спецыяліст. Калі прыгадаць леташні год, дык тады нават зімой не было снегу і стаялі плюсавыя тэмпературы паветра. У такіх умовах грыбы можна збіраць ці не да Новага года. Пра масавасць тут гаварыць не выпадае, тым не менш асобным аматарам «ціхага паляванне», не выключана, можа і пашанцаваць. «Неўраджай» грыбоў, вядома, сказаўся і на нарыхтоўках: пакуль іх закуплена ад насельніцтва менш чым летась, хоць гэтыя дары лесу прымаюцца ў любых гандлёвых і нарыхтоўчых пунктах без абмежаванняў. Па якіх цэнах?

Паводле слоў прэс-сакратара Белкаапсаюза Алены Мохар, у залежнасці ад рэгіёна і стану саміх грыбоў, напрыклад, падасінавікі і бабкі прымаюцца ад насельніцтва па 1,5—2 тысячы рублёў за кілаграм, грузды і апенькі — па 800—1,5 тысячы рублёў, лісічкі — па 4—5 тысяч, белыя грыбы — па 5—7 тысяч рублёў за кілаграм.

Дарэчы, некаторая іншая ласная і садовая вітамінная прадукцыя нарыхтоўваецца па наступных цэнах. За кілаграм журавін здатчыкам плацяць зараз 4,5—6 тысяч рублёў, за чарнаплодную рабіну — 800—1000 рублёў. за чырвоную — 550—850 рублёў. Мы пісалі раней, што сёлета неўраджай і на яблыкі, што адбіваецца і на закупачных цэнах. Апад зараз нарыхтоўшыкі бяруць па 350—400 рублёў, таварныя яблыкі (знятыя ўручную і прызначаныя для захоўвання) — па 1—1,3 тысячы рублёў за кілаграм.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЧАСТАВАЎ ДЗЯЦЕЙ... АЛКАГОЛЕМ

У Магілёўскую абласную дзіцячую бальніцу з вострым алкагольным атручэннем трапілі два хлопчыкі з вёскі Брылі Магілёўскага раёна.

Дзяцей, якім 15 і 10 гадоў, прывезла позна ўвечары «хуткая дапамога». Высветлілася, што 42-гадоваму мужчыну, рабочаму прадпрыемства, спатрэбілася кампанія для выпіўкі, і ён прапанаваў дзецям танны алкаголь. У выніку медыкам давялося ратаваць малых, якія пайшлі на папраўку і цяпер выпісаліся дадому.

У Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы пракаментавалі, што, на жаль, гэты выпадак абсалютна не адзінкавы.

Алена КАЗЛОВА.

СВЯТА МІЛІЦЭЙСКАЙ ЭЛІТЫ

Сёння спаўняецца 89 гадоў з моманту ўтварэння беларускага крымінальнага вышуку

Іх служба была і застаецца самай цяжкай і адначасова самай пачэснай. Крымінальны вышук па праву называюць міліцэйскай элітай, «праваахоўнай гвардыяй», якая ўвесь час знаходзіцца на вастрыі барацьбы са злачыннасцю. На іх ускладзены вышук самых небяспечных, бязлітасных і дзёрзкіх злачынцаў: забойцаў, гвалтаўнікоў, рабаўнікоў, зладзеяў і прайдзісветаў.

За 89 гадоў свайго існавання служба крымінальнага вышуку нашай краіны развівалася, перабудоўвалася, удасканальвалася, але ніколі не ведала «лёгкага жыцця». Не выключэнне і сённяшнія часы.

Як адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення крымінальнага вышуку МУС краіны Анатоль Савіцкі, галоўным накірункам дзейнасці беларускіх сышчыкаў заўсёды было і застаецца раскрыццё злачынстваў супраць асобы, здароўя і маёмасці грамадзян. Напрыклад, за 9 месяцаў гэтага года было зарэгістравана больш за 600 забойстваў, з якіх толькі 32 засталіся нераскрытымі. Прычым гэта не азначае, што не знойдзеныя пакуль забойцы пазбегнуць пакарання. Іх пошук працягваецца. Дарэчы, сёлета адмысловая служба крымінальнага вышуку затрымала і перадала ў рукі правасуддзя больш за пяць тысяч злачынцаў, якія хаваліся ў нашай краіне і за мяжой. Зусім нядаўна адзін з такіх уцекачоў, які ў 1999 годзе здзейсніў кроўную помсту — пазбавіў жыцця забойцу свайго брата, быў знойдзены нават у Швецыі. Дарэчы, адмысловае падраздзяленне крымінальнага вышуку летась раскрыла каля 100 забойстваў мінулых гадоў. Сёлета, паводле слоў кіраўніка падраздзялення Віталя Субеляніна, таксама неблагія вынікі. Напрыклад, у сышчыкаў ёсць усе падставы меркаваць, што будуць раскрыты тры забойствы, учыненыя ў сярэдзіне 90-х гадоў. Адно з такіх злачынстваў на рахунку сумнавядомай «марозаўскай групоўкі».

Былі сёлета ў Беларусі выпадкі і «заказных» забойстваў. Але гэта, паводле слоў Анатоля Савіцкага, адзінкавыя факты. Пераважная большасць злачынстваў такога кшталту адбываецца на «бытавой глебе». Айчынныя «кілеры», як правіла, робяць свае ліхія справы ў нецвярозым стане. Зрэшты, і самі ахвяры забойцаў, а таксама гвалтаўнікоў і рабаўнікоў нярэдка трапляюць у бяду менавіта з-за свайго злоўжывання алкаголем. Так, напрыклад, у ліпені гэтага года была згвалтавана 24-гадовая жыхарка Баранавіцкага раёна. Дзяўчына знаходзілася ў такім стане алкагольнагаап'янення, што нават не магла ўспомніць, у які аўтамабіль яе пасадзілі гвалтаўнікі, куды і хто яе вёз. Тым не менш сышчыкам удалося раскрыць гэтае злачынства. Не ўдалося пазбегнуць пакарання і забойцы 10-гадовага Алега Куліка. Нагадаю, што гэтае злачынства сёлета здарылася ў Бабруйску. Як высветлілася, яго ўчыніў 14-гадовы вучань той жа школы, дзе вучыўся Алег.

Сярод маёмасных злачынстваў найвялікшую небяспеку ўяўляюць разбойныя напады і рабаўніцтвы. За 9 месяцаў было зарэгістравана 811 такіх нападаў на людзей. Анатоль Савіцкі, у прыватнасці паведаміў, што практычна раскрыта серыя нападаў на грамадзян Віцебска, Магілёва і Барысава. Злачынцы рабавалі жыхароў памянёных гарадоў, трапляючы ў жылыя памяшканні пад выглядам работнікаў ЖЭСаў і «Гаргаза».

Зладзеі найчасцей выкрадаюць у нашых суграмадзян менавіта «мабільнікі» — 23 тысячы за 9 месяцаў...

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Спрэчныя нататкі

ТАЛЕРАНТНАСЦЬ ЦІ РАЎНАДУШША?

Пісаць пра гэты выпадак не думаў па этычных меркаваннях. Усё здарылася са старым чалавекам, які меў некаторыя псіхічныя адхіленні, але па многіх СМІ прайшла інфармацыя, што жонка старога два гады праляжала мёртвай у кватэры, а ён увесь гэты час атрымліваў яе пенсію. Вырысаваўся вобраз дзеда, які спецыяльна ўтойваў смерць жонкі, каб пажывіцца. А ўсё гэта, мякка кажучы, не адпавядае ісціне.

У Баранавічах на вул. Кірава ў адным з дамоў жыла сям'я С. Старыя не мелі дзяцей, але трымалі кошак і сабаку. З-за гэтага ў іх узнікалі праблемы з суседзямі, бо калі сабаку дзед выводзіў на прагулку, то кошкі такой радасці не мелі, і з кватэры дыхала смуродам. І тым не меней пра старога жыльцы пад'езда гавораць, што ён быў чалавекам ветлівым. Жонка старога хварэла, у 74-гадовай жанчыны былі праблемы з нагамі і яна часцей за ўсё сядзела на лаўцы каля пад'езда.

Далей расказвае загадчыца паштовага аддзялення № 10 Святлана Швайдзюк:

— Пенсію старым насілі мы. Апошні раз наш паштальён бачыла бабу Любу 18 сакавіка, калі прынесла грошы. Жанчына ляжала з жоўтым тварам і адчувалася, што ёй моцна нездаровіцца, але старая распісалася за пенсію. Гаспадар гаварыў, што выкліча «хуткую дапамогу» і жонку забяруць. Калі ж паштальён праз месяц зноў прынесла пенсію, то дзверы ў кватэру С. ніхто не адчыніў. Зазірнула да суседзяў, але тыя сказалі, што нічога не ведаюць. Аднойчы паштальён сустрэла старога на вуліцы і той сказаў, што ўсё нармальна. Пенсію С. атрымліваў толькі сваю і тое, што, быццам бы, яшчэ яму выдавалі і грошы жонкі, то гэта выдумка.

Жанчына, відавочна, памерла ў канцы сакавіка ці ў красавіку, а старыя нікому пра гэта не гаварыў, бо думаў, што яна яшчэ ўстане. Мела ўжо пяць дзён і можа здарыцца, што і сабака з кошкай таксама стануць муміямі.

І падаўся я міліцэйскі ўчастак. Пасля размовы са старшым участковым зразумеў, што не ўсё так проста, як думалася. Пасля перамоў па мабільніку старшы лейтэнант заявіў, што ўчора ўчастковы ездзіў у псіхдыспансэр да С. за ключом, але галоўны ўрач не пусціў... І ўвогуле, што ўчастковы можа ў такой сітуацыі зрабіць?

Узнікла сумненне, бо міліцыя прадстаўляе ўладу і ад участковага не маглі адмахнуцца проста так.

— Наша ўстанова закрытага тыпу, і каб трапіць сюды, необходна выканаць фармальнасці — мець дазвол. Прыйшоў прадстаўнік міліцыі і тэлевізійнікі з камерай, каб зняць С., а гэтага я не мог дазволіць. Ды ўвогуле, каб сустрэцца з хворым і ўзяць у яго ключы, патрэбна нейкая падстава-даведка, — растлумачыў галоўны ўрач дыспансэра А. Драздоў.

Ад кожнага патрабавалася нямнога — выканаць сумленна свае абавязкі на рабочым месцы...

А зараз вернемся да вядомай нам кватэры. Усё было вырашана вельмі проста. Патэлефанаваў пракурору горада і папрасіў дапамагчы.

— Не думаю, што гэта такая ўжо і праблема, — сказаў Аляксандр Смаль.

Праз нейкую гадзіну моцна скуднелы бобік ужо бегаў па вуліцы і яго тут жа жанчыны пачалі частаваць.

Да напісання гэтых радкоў давялося пагаварыць з рознымі людзьмі, у тым ліку і суседзямі С. Не ўсё з'ясавалася, але тут тэлефонны званок прымусіў задумацца. Гаспадара забралі ў псіхдыспансэр, а сабака і кошка засталіся ў апячатанай кватэры. Жанчына папрасіла, каб «Звязда» дапамагла вызваліць жывёлін, бо мінула

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Электрэт»

ШТО ЧАЛАВЕКУ ТРЭБА, КАБ ПАВАГУ ДА СЯБЕ МЕЦЬ?

У таварыстве «Электрэт» арганізавалі сваю справу, якую робяць адказна і надзейна. Пры гэтым тут працуюць на рэальнае энергазберажэнне

Многія ўстановы ў нашай краіне абсталяваны сваімі энергазберагальнымі «Электрэта». Назавём асобныя з іх: гэта выставачны комплекс па вуліцы Янкі Купалы ў Мінску, Палац моладзі, гандлёвы цэнтр «Карона», многія школы і іншыя навучальныя ўстановы, прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы; пры гэтым, напэўна, асабліва варта адзначыць удзел «Электрэта» ў асвятленні Нацыянальнай бібліятэкі, у якую, зразумела, не маглі патрапіць выпадковыя падрадчыкі, — у ёй «Электрэт» выканаў найбольшыя аб'ёмы работ. Вядома, па сваёй спецыфіцы... Такая папулярнасць «Электрэта» і яго святліняў далёка не выпадковая. Святліні «Электрэта» — эстэтычныя, а галоўнае — энергазберагальныя. Іх менавіта так і называюць — энергазберагальнымі.

Адразу ж удакладнім: выпуск энергазберагальных святліняў — пераважны накірунак дзейнасці «Электрэта», але не адзіны. Тут таксама маюць у сваёй вытворчасці сонечныя воданагравальныя батарэі і сонечныя батарэі па вырабе электрычнасці.

І яшчэ адно істотнае ўдакладненне: усё, што прапануе «Электрэт», — тут жа, у яго вытворчасці, праектуецца і непасрэдна вырабляецца; яго спецыялісты таксама самі ж манціруюць свае вырабы на аб'ектах, бяруць іх потым на гарантыйнае абслугоўванне.

Такім чынам, усю дзейнасць «Электрэта» пранізвае тэма энергазберажэння. «Мы неяк ужо адразу, на самым пачатку свайго заснавання, праніклiся ідэалогіяй энергазберажэння, працуем пад гэтай ідэалогіяй цяпер», — адзначае дырэктар «Электрэта» Аляксандр Паляшчук. Што да гэтых слоў варта дадаць? Вельмі цяпер патрэбная для нас ідэалогія; яе, варта нагадаць, па сутнасці і паставілі ў краіне ў аснову ўсёй народнагаспадарчай дзейнасці.

Аднак ці шмат можна зэканоміць, так бы мовіць, на электралямпачцы, гэта значыць выкарыстоўваючы тыя ж энергазберагальныя святліні? У «Электрэце» прыводзяць такія лічбы: у краіне 15 мільёнаў святліняў не з'яўляюцца энергазберагальнымі; і 30—40 працэнтаў электраэнергіі можна эканоміць, калі замяніць іх. Рэзерв, з улікам таго, што 10—12 працэнтаў усёй электраэнергіі выкарыстоўваецца менавіта на асвятленне, — вельмі вялікі.

Увогуле, першапачатковай мэтай дзейнасці таварыства «Электрэт» было наладжванне выпуску высокаадчувальных так званых электрэтных мікрафонаў (ужо зразумела, адсюль і назва таварыства) для тэлефоннай апаратуры, прычым з разлікам рэалізацыі іх у многіх рэгіёнах былога Саюза. Гэта было па сіле тым спецыялістам, якія стварылі таварыства і працавалі да гэтага ў галіне радыётэхнікі і электронікі. Напрыклад, Аляксандр Паляшчук, адзін з асноўных заснавальнікаў, быў у свой час намеснікам галоўнага інжынера завода «Транзістар» аб'яднання «Інтэграл». Аднак не стала Саюза, змяніліся планы ў «Электрэта», у якім і пачалі асвойваць цяперашнія накірункі, прычым паклаўшы ў аснову сваёй дзейнасці выпуск менавіта энергазберагальных прыбораў. Як адзначаюць цяпер у «Электрэце», адчулі, што ўсё гэта вельмі важна і выгадна, і, адпаведна, уся гэта справа будзе мець добрую перспектыву. І ўжо адразу ж у «Электрэце» наладзілі цеснае супрацоўніцтва з Камітэтам па энергазберажэнні, прычым нават сталі атрымліваць ад яго даручэнні на распрацоўкі пэўных канкрэтных вырабаў. З асаблівай эфектыўнасцю гэта супрацоўніцтва праявілася ў сумеснай рабоце (яна працягваецца і цяпер) па выкананні энергазберагальных мерапрыемстваў у раёнах, што пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі. Гэтыя мерапрыемствы выконваюцца ў рамках спецыяльнай пазыкі Сусветнага банка. Такім чынам, энергазберагальнае абсталяванне «Электрэта» стала надзейна працаваць на патрэбы жыхароў гэтай зоны.

■ ■ ■

Аднак перш чым расказваць пра вартасці і асаблівасці энергазберагальнага абсталявання «Электрэта», спачатку трохі пра іншае. Можа, нават больш істотнае. «Электрэт» (а дарэчы, працуе тут каля 200 чалавек) месціцца цяпер на некалькіх аддаленых адзін ад аднаго ўчастках — у арандаваных або ўжо набытых ва ўласнасць памяшканнях (асноўная вытворчасць знаходзіцца на плошчах арандаванага Дома быту ў Бараўлянах пад Мінскам). Усё на гэтых участках літаральна забіта пад завязку, выкарыстаны кожны квадратны метр. Словам, не могуць пахваліцца ў «Электрэце» тымі плошчамі, якія пры гэтым нярэдка абсалютна не задзейнічаны, што маюць нашы асобныя вялікія прадпрыемствы. Аднак з якім гонарам паказвалі гэтыя ўчасткі з размешчаным на іх абсталяваннем, што дакладна садзіць на электрамантажныя платы невялічкія крышталікі мікрасхем, што наносіць на каркасы будучых святліняў палімерную афарбоўку, і іншае абсталяванне, а таксама добраўпарадкаваныя бытавыя памяшканні дырэктар «Электрэта» Аляксандр Паляшчук і галоўны інжынер даччынай кампаніі прадпрыемства Эдвард Падзько... Безумоўна, як і на многіх іншых прыватных прадпрыемствах, некалі пачыналі ў «Электрэце» практычна на голым месцы. Цяпер жа, як падкрэсліваюць тут, толькі падаткаў плацяць штомесяц па 100 мільёнаў рублёў, маюць штомесячную выпрацоўку на чалавека каля 5,5 мільёна.

Арганізаваць і наладзіць такую вытворчасць, уключыць яе ў агульны народнагаспадарчы абарот, безумоўна, каштавала нямала сродкаў і сілы. Як падкрэслівае цяпер Аляксандр Паляшчук, літаральна кожны рубель зароблены прыбытку ўкладвалі ў вытворчасць, у набыццё абсталявання, у далейшае развіццё. На распрацоўку і асваенне вырабаў, іх укараненне. Пры гэтым ніводнага рубля дзяржаўнага капіталу не задзейнічалі, акрамя крэдытаў банкаў. А яшчэ ўсё рабілі, каб найлепшым чынам заявіць на рынку пра сябе, заваяваць і ўсяляк падтрымліваць добры імідж фірмы. Такая, здавалася б, неістотная дэталь: «Электрэт» мае ў сваім штаце нават маляроў. Навошта? А каб адразу ж наводзіць адпаведны фасон на столь і сцены пасля мантажу святліняў. Каб не псаваць свой імідж, што магло б здарыцца, калі б гэту работу выканаў нехта іншы, але не зусім акуратна. Словам, усё — «пад ключ». У «Электрэта» нямала ў краіне даволі моцных канкурэнтаў — ён заўсёды выглядае сярод іх годна, і ў першую чаргу на тэндарах, якія папярэднічаюць тым жа заказам. Каля 5—7 працэнтаў сваёй энергазберагальнай тэхнікі «Электрэт» прадае на ўкраінскім рынку, апошнім часам актыўна намацвае расійскі рынак. Што датычыцца асноўнай прадукцыі «Электрэта» — электрасвяцільняў, іх распрацавана і асвоена больш за 100 відаў. Гэта для таго, каб заказчык меў большы выбар, каб можна было больш прадаваць. Крыху забягаючы наперад, скажам: у аснове энергазберагальнага эфекту святліняў «Электрэта» ляжыць электронная пускарэгулюючая апаратура, якой тут гэтыя святліні аснашчаюць (і якую, адпаведна, самі ж вырабляюць); не так даўно ў «Электрэце» асвоілі выпуск больш сучасных энергазберагальных святліняў на светлавых дыёдах. Гэтыя зручныя святліні, якія маюць два рэжымы асвятлення, ужо з'явіліся ў бальніцах, на ўваходах у пад'езды жылых дамоў... Калі крыху падсумаваць усё сказанае вышэй, варта падкрэсліць: у «Электрэце» не проста вырабляюць свае энергазберагальныя святліні — тут у першую чаргу «зрабілі сябе», зрабілі (робяць) справу, якой можна ганарыцца. І ганарацца. Напрыклад, вось што сказаў падчас гутаркі Аляксандр Паляшчук: «Душа радуецца, калі вечарам праязджаю каля выставачнага комплексу па вуліцы Я. Купалы: прыгожыя, яркія гірлянды агнёў... Рукамі нашых працаўнікоў зроблена. Некалі мы знялі тут са столі 50 тон старых святліняў, якія ўжо толькі бралі электраэнергію, ды амаль ніколькі не святілі. Замест тых 50 тон павесілі 7...»

— Аляксандр Мікалаевіч, некалі, на этапе станаўлення, вам і вашым кампаньёнам, вядома, было нялёгка, цяпер — лягчэй? Вам, напэўна, ужо і зайздросцяць?..

— Лягчэй не стала, хутчэй — наадварот: калі раней больш думалі пра грошы, пра тое, як іх зарабіць, то цяпер — не толькі і нават не столькі пра іх. А ў першую чаргу — пра заказы, пра збыт, пра людзей, у цэлым пра тую ўжо маштабную справу, што поўнасцю зацягнула цябе ў свой вір, з якога, напэўна, калі б і моцна хацеў, ужо не выбраўся б... А наконт зайздроснікаў — на іх проста не звяртаю ўвагі. Ды і няма часу на гэта — тую ж справу рабіць трэба. А яна падабаецца. Ды і мяшканні размешчана святліня; у асобных выпадках аўтаматыка прадугледжвае некалькі рэжымаў асвятлення. Гэта, аднак, не ўсё. У праектнай групе «Электрэта» дакладна разлічваюць факусіроўку, вугал падзення святла і г.д. У выніку, напрыклад, святліня «Электрэта» ў 58 ват можа замяніць сабой,

менш, у «Электрэце» выконваюць адзінкавыя разавыя заказы і стаяць свае сонечна-электрычныя батарэі там, дзе «невмоготу». У прыватнасці, гэтыя батарэі працуюць на пастах чарнобыльскай зоны, у вёсцы, дзе нясуць вахту «чарнобыльцы»-вучоныя. А колькі гадоў таму ў «Электрэце» выканалі наступны заказ. Звярнуліся да іх прадстаўнікі Белавежскай пушчы: ужо даўно жывуць сярод пушчы ў сваіх старэнькіх домiках дзве бабкі. Без электрычнасці. Пераехаць жа кудынебудзь — ні ў якую, а цягнуць да іх праз пушчу лінію электраперадачы — таксама неяк не выпадае. Карацей кажучы, вырабілі ў «Электрэце» ды паставілі на падворках гэтых дзвюх пустэльніц сонечныя электрабатарэі: і электрычнае святло з'явілася, і тэлевізар можна паглядзець... Тым болей не зрушыш іх з наседжанага месца цяпер.







Што трэба для таго, каб нармальна жыць і зарабляць

Асобныя фрагменты з гутаркі з Аляксандрам ПАЛЕШЧУКОМ:

— Аляксандр Мікалаевіч, вы працуеце, і ўжо даўно, у прыватным бізнэсе, добра ведаеце ўсю адпаведную сітуацыю ў ім. Што трэба, каб прыватны бізнэс развіваўся больш актыўна?

— А ён і развіваецца, хоць нехта і мяркуе, што ўсё ў ім не так, як трэба. Што адбываецца? Ведаеце, ёсць шмат людзей, якія прыходзяць у бізнэс і хочуць, так бы мовіць, адразу схапіць. Але ж так нідзе не бывае. Каб жыць нармальна, нармальна зарабляць, трэба вельмі шмат працаваць. Гэта не проста агульнавядомае правіла, гэта — з уласнага вопыту. Але, скажам, завёў чалавек, які хацеў бы «шмат і адразу», сваю ўласную справу, а «схапіць» не атрымліваецца, і яго перастае цікавіць гэты занятак, ён перастае працаваць. А ўсім расказвае: маўляў, задушылі падаткамі. Аднак прааналізуем падатковае заканадаўства Чэхіі, Іспаніі, Францыі, у прынцыпе — амаль любой еўрапейскай краіны, за выключэннем свабодных эканамічных зон, — яно намнога больш жорсткае. І там больш жорстка патрабуюць яго выканання. У Амерыцы спачатку пасадзяць у турму, калі ты не выконваеш гэта заканадаўства, а толькі потым будуць разбірацца, чаму не выконваеш... Дарэчы, у нас дзяржава дае ўсім неблагую льготу: калі ты развіваешся, будуеш, купляеш абсталяванне, нарошчваеш магутнасці, падатак на прыбытак не плаціш. Развівайся, калі ласка. Словам, наяве дзяржаўны клопат. Радавацца гэтаму трэба. Нармальная абстаноўка для вядзення бізнэсу. І гэта добра пацвярджае той факт, што, напрыклад, цяпер у Мінскім раёне палова падаткаў паступае менавіта ад прыватнага бізнэсу. І не трэба тут плакацца. Адзінае, чаго хацелася б, каб не так часта мяняліся законы і правілы «гульні», і тым больш не ўводзіліся заднім чыслом. А такое, на жаль, бывае. А калі мяняюцца гэтыя правілы і законы, — гэта вельмі моцна ўплывае на эканоміку бізнэсу. Напрыклад, тое, што ты пачаў рабіць, раптам становіцца нявыгадным, і, наадварот, тое, што ты адразу адкінуў, — аказваецца больш выгадным. Словам, пачынаюцца хістанні. А грошы рэзкіх рухаў не любяць, яны патрабуюць плаўнасці ва ўсіх дзеяннях. Яны тады нараджаюцца... Падкрэслю, у нас усё нармальна, усё рухаецца, мы няспынна развіваемся, хоць і трацім на гэта немалыя грошы. Вядома, можна было б той прыбытак, што зарабляем, і ў кішэню пакласці, пад яблыню закапаць, але ж ён не будзе ў такім разе працаваць... Вельмі ганарымся сваёй цяперашняй работай у чарнобыльскай зоне. Што ў сувязі з гэтым хацеў бы асабліва адзначыць: можа, усе мы ўжо неяк прызвычаіліся з наступствамі той аварыі, што адбылася, а вось людзі, якія жывуць там, — безумоўна, не. Яны неяк па-іншаму на жыццё глядзяць — больш асэнсавана, ці што; яны больш цэняць гэта жыццё, якое, як кажуць, дадзена нам адзін раз. І ў якім трэба абавязкова пакінуць нешта зробленае табой. Для нас, асабіста для мяне — гэта наша цяперашняя справа.

■ ■ ■

Прадоўжым думкі Аляксандра Палешчука і наш расказ пра ўсё ўбачанае ў «Электрэце». Падчас гутаркі Аляксандр Паляшчук таксама сказаў: «Ёсць у нас адна гэткая свайго кшталту ўстаноўка: чалавек у нас павінен працаваць з добрым настроем. Я сам сачу за гэтым. Гэта важна не проста дзеля той жа прадукцыйнасці (хоць з прадукцыйнасцю тут сувязь прамая; яе, гэту прадукцыйнасць, ніякімі палкамі не выб'еш), гэта патрэбна самому чалавеку. Ён жа трэцюю частку жыцця на рабоце праводзіць, трэба памятаць пра гэта...»

Добразычлівасць і паважлівыя адносіны адзін да аднаго — гэта яўная адметнасць калектыву «Электрэта». Безумоўна, не самыя спрыяльныя ўмовы мелі ў «Электрэце» на самым пачатку. Затое цяпер тут з гонарам за зробленае паказваюць свае акуратныя душавыя і туалеты, пакоі для адпачынку, якія абсталяваны нават мікрахвалевымі печамі, аўтаномныя воданагравальнікі ў сваіх прыстасаваных памяшканнях (да цэнтралізаванага ж забеспячэння — далёка), саўну з басейнам... Словам, усё — для людзей. Цікавая дэталь: тут (у прыватнасці на мантажным участку) нават скансцруявана сістэма падачы цёплага паветра да ног мантажнікі. Ну ці шмат дзе ў нас можна сустрэць такія сістэмы? Дарэчы, «супакоім» тых, хто, можа, ужо падумаў пра «Электрэт», як пра месца сваёй будучай работы. Адсюль самастойна не звальняюцца. Тым больш, і сярэдняя зарплата — 800 тысяч рублёў. Хіба што можна мець на ўвазе: «Электрэт» развіваецца. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць і тое, што тут цяпер інтэнсіўна вядуць работы па рэканструкцыі былога даволі маштабнага збудавання (на 800 квадратных метраў, у якім некалі размяшчаліся калгасныя майстэрні). «Электрэт» купіў іх і цяпер, па сутнасці, усё перарабляе тут, пры гэтым кіруецца сваімі даволі высокімі стандартамі, якія датычацца ўмоў працы людзей. Дарэчы, як ужо зазначана, цяпер выстворчасць «Электрэта» раскідана па некалькіх пунктах, нямала нязручнасцяў дастаўляе перакідка за 40 кіламетраў, з аднаго ўчастка на другі, металапрофілю — пасля яго нарэзкі на афарбоўку і з апошняй назад, на мантаж... «З уводам новых плошчаў, пасля іх рэканструкцыі, усю вытворчасць размесцім тут, — гаварыў Аляксандр Паляшчук. — А ў Шчамысліцы (там размешчана частка вытворчасці «Электрэта») застанецца наша праектная група, абсталюем дэманстрацыйную залу...»

Варта сказаць тут і пра іншую новабудоўлю «Электрэта», дакладней — толькі што завершаную. Па сутнасці, гатова да эксплуатацыі ўзведзеная ім у Бараўлянах выдатная пральня — з дзвюма рабочымі заламі, з сучасным высока прадукцыйным імпартным абсталяваннем у іх. Пральню «Электрэт» узвёў для пасялковага Савета ў якасці арэндной платы за прадастаўленыя плошчы Дома быту. Словам, атрымліваецца як бы «тое на тое». Але калі не было б таго ж альянса «Электрэта» з пасялковым Саветам, напэўна, не з'явілася б ў Бараўлянах і гэтай выдатнай сучаснай пральні. Да таго ж і бытавыя службы, якія працавалі ў Доме быту — швейны ўчастак, фотаатэлье, цырульня, засталіся, так бы мовіць, пры справе — яны, згодна з умовамі дагавора, перайшлі ў веданне «Электрэта». У апошнім пры гэтым зазначаюць: гэта цяпер таксама нашы людзі.

■ ■ ■

І яшчэ дадзім слова Аляксандру ПАЛЕШЧУКУ:

— Гэта добра, што ў нас нарэшце гэтак грунтоўна ўзяліся за справу энергазберажэння, добра, што з'явілася адпаведная дырэктыва Прэзідэнта, якая надала сістэмнасці ўсёй гэтай рабоце.

Вельмі хочацца, каб барацьба за энергазберажэнне стала агульнанацыянальнай, усвядомленай, а не ператварылася ў раздачу грошай тым, «хто мае патрэбу», як рабілася гэта да нядаўняга часу. Энергазберагальныя мерапрыемствы ў тэхнічнай сферы дарагія, і ўкараняць іх толькі за кошт дзяржавы — гэта на доўгія гады з далейшым адставаннем ад тэхнічнага прагрэсу. Энергазберажэнне павінна праводзіцца ў тым ліку за кошт арганізацыйных і заканадаўчых мерапрыемстваў. Да прыкладу: шмат гадоў выдзяляюцца сродкі на ўкараненне прыбораў уліку вады, цяпла і г.д. А можна было б прыняць рашэнне: ёсць улік вады — адзін тарыф, няма — другі тарыф, больш высокі, і той, каму гэта стала б нявыгадна, купіў бы лічыльнік вады. Тое ж самае і з электраэнергіяй.

А колькі гаварылася пра ўвядзенне сістэмы заахвочвання работнікаў бюджэтнай сферы за эканомію электраэнергіі і цяпла? Сістэма выкладзена на паперы, але не працуе... У нас дастаткова сонца, а сонечных воданагравальнікаў не выраблялі... Заклікаем пераходзіць на мясцовае паліва — і адначасова прадастаўляем ільготы на электраэнергію для вёскі...

Закрану сферу асвятлення. У нас каля 15 мільёнаў устарэлых святліняў, а Лідскі завод электравырабаў і іншыя нашы калегі прастойваюць, бо ў патэнцыяльных заказчыкаў не хапае грошай на ўкараненне энергазберагальных святліняў, а калі і ўкараняюцца, то імпартныя, якія не адпавядаюць нашым стандартам. У багатым Еўрасаюзе вырашылі проста: забаранілі дросельныя святільні і ўсё тут. А ў нас іх, як і лямпы напальвання, усё яшчэ праектуюць!

Многае можна ўкараняць менавіта без грошай дзяржавы. Вядома, гэтым мог бы больш актыўна займацца Камітэт па энергазберажэнні, але ён неяк згубіўся ў нетрах Камітэта па стандартызацыі і жыве сам па сабе, а энергазберажэнне — само па сабе. Упэўнены, што Дырэктыва № 3, наступныя дзеянні органаў улады ўсё ж узніміць усіх нас на сапраўдную работу па энергазберажэнні, і справа не звядзецца, паўтару, на выбіванне грошай з дзяржаўнай казны на асобныя мерапрыемствы.

Іван БАРАНОЎСКІ.

НА ЗДЫМКАХ:

1. ТАА «Электрэт» і яго кіраўнік неаднаразова прызнаваліся лепшымі ў прадпрымальніцкай дзейнасці.

2. Супрацоўніца «Электрэта» Вольга КАСКО дэманструе сістэму асвятлення ў адным з кабінетаў таварыства.

3. Спецыяльныя святільні «Электрэта» для спартыўнай залы.

4. Дырэктар ТАА «Электрэт» Аляксандр ПАЛЯШЧУК.

5. Тэхнік Яўген ЗАПРУДСКІ і інжынер Міхаіл САЙКО за распрацоўкай праекта асвятлення.

6. Сонечная воданагравальная сістэма «Электрэта» надзейна працуе на жывёлагадоўчым комплексе гаспадаркі «Белая Русь».

7. У адной з мінскіх школ, якую «Электрэт» абсталяваў сваімі энергазберагальнымі святільнямі.

8. Так выглядае сонечная электрычная батарэя «Электрэта». Паказвае батарэю мантажніца Таццяна ЖАРНАСЕК.

9. Ірына БАХЦЕЯРАВА выконвае зборку платы.

10. Мантажнік Сяргей КАНАНЕНКА за машынай, якая ўстаноўлівае на платы радыёэлементы.

11. Гэты падворак у Белавежскай пушчы абсталяваны сонечнымі батарэямі «Электрэта» *(фота з архіва прадпрыемства)..*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Каментарый кіраўніка УП «Белэнергазберажэнне» Аляксандра САВАНОВІЧА:

— Наша прадпрыемства займаецца суправаджэннем крэдытаў Сусветнага банка для мэтаў энергазберажэння ў сацыяльнай сферы. Гэта датычыцца рэнавацыі дамоў, кацельняў і г.д., у тым ліку і замены ў школах, бальніцах, садках электрасвяцільняў — менавіта на энергазберагальныя. Наша задача — падабраць аб'екты, арганізаваць тэндары, а далей — сачыць за рэалізацыяй адпаведных праектаў. Фірма «Электрэт» у гэтым плане з'яўляецца нашым надзейным добрым партнёрам. Яна выйграла тэндарныя таргі практычна па ўсіх рэгіёнах рэспублікі і ў рамках указанага праекта замяніла 139 тысяч святліняў. Асноўная вартасць святліняў «Электрэта» ўжо зразумелая — яны энергазберагальныя. Зроблены яны на базе электроннай апаратуры, а гэта дазваляе заўсёды мець добрую асвечанасць памяшканняў і адначасова — зніжанае энергаспажыванне. Электронная апаратура выключае і непрыемныя эфекты гулу і мігання люмінесцэнтных лямпаў. Мы вядзём маніторынг па зроку дзяцей (на тых аб'ектах, дзе ўстаноўлены энергазберагальныя святільні «Электрэта» з электроннай рэгулюючай апаратурай) — вынікі гэтага маніторынгу станоўчыя. З дапамогай святліняў «Электрэта» ўдалося дабіцца добрай асветленасці ў класах школ, якая цяпер павінна мець значэнне 500 люкс (там, дзе работы па замене электраасвятляльнага абсталявання не праводзіліся, — звычайна фіксуецца 200—250 люкс), аўтаматыка іх апошніх мадэляў змяняе светлавы паток ад вокнаў да больш зацененых месцаў. Калі мець на ўвазе новую норму асветленасці працоўнага месца ў 500 люкс і калі дапусціць, што мы дабіваліся б гэтай нормы з дапамогай старых святліняў, то ў цэлым энергаспажыванне ўзрасло б недзе на 40 працэнтаў.

На «Электрэце» першымі ў рэспубліцы распрацавалі так званыя антывандальныя святільні для ўстаноўкі іх у пад'ездах жылых дамоў, прычым, зноў-такі, з зусім малым энергаспажываннем — гэта святільні на 9—11 ват. Гаворачы пра энергазберагальныя святільні «Электрэта», варта адзначыць і наступны факт: тэрмін іх службы — 8—10 тысяч гадзін, у той час як, напрыклад, лямпачка напальвання здольная праслужыць каля тысячы гадзін. Немалаважны і такі момант: тыя святільні, якія мы цяпер устанаўліваем у сацыяльных установах, маюць высокі другі клас бяспекі, што важна пры іх абслугоўванні.

Ужо называлася колькасць энергазберагальных святліняў, устаноўленых «Электрэтам» толькі па нашаму даручэнню. Гэта зроблена ў рамках энергазберагальных мерапрыемстваў, выкананых па ранейшай пазыцы Сусветнага банка, цяпер жа вядуцца работы па новай пазыцы банка, якімі ахоплены рэгіёны чарнобыльскай зоны. Гэтыя работы — таксама з удзелам «Электрэта». Яго энергазберагальная тэхніка заўсёды атрымлівае высокую ацэнку на рознага роду выстаўках.



Яўген БУДЗІНАС

Сумная вестка — учора раніцай памёр Яўген Будзінас, вядомы пісьменнік, ідэйны натхняльнік і арганізатар знакамітага музея «Дудуткі», у якім лічыць за гонар пабываць кожны, хто цікавіцца пабываў культурай свайго народа і які стаў адной з візітовых картак краіны. Памёр у нябоўныя 64, не адолеўшы цяжкай хваробы. У свой час працаваў у маладзёжнай газеце «Знамя юности», быў уласным карэспандэнтам па Беларусі Агенцтва друку «Навіны», спецыяльным карэспандэнтам часопіса «Дружба народов» па Беларусі і Прыбалтыцы.

Пахаваны Яўген Будзінас будзе, як мяркуецца, у Дудутках. Зробленае, як і напісанае, застаецца людзям. Смуткуем, спачуваем усім, хто ведаў нашага калегу-журналіста, чалавека, які любіў жыццё, людзей і нямала зрабіў для іх.

Звяздоўцы.

Спорт-тайм

БРАВА, ДЗЯЎЧАТЫ!

Жаночай зборнай Беларусі па баскетболе ўжо можна спяваць дыфірамбы: наша каманда — дэбютантка чэмпіянату Еўропы — змагла прабіцца ў васьмёрку наймацнейшых камандаў кантыненту.

У заключным матчы другога этапа беларускі перамаглі сваіх саперніц па групе «F» італьянак — 66:51. Самай выніковай была Алена Леўчанка (18 ачкоў). Наша зборная ў плэй-оф выйшла на чэшскіх баскетбалістак.

ДЭМАРШ КУТУЗАВА

Нападаючы італьянскай «Пізы» Віталь Кутузаў адмовіўся ад запрашэння ў нацыянальную зборную Беларусі на адборачны матч супраць Люксембурга і таварыскі з Ізраілем.

Свой намер ён растлумачыў у лісце ў беларускую федэрацыю футбола: «Піза» паспяхова выступае ў чэмпіянаце і хоча заняць высокае месца. Зборная ж завяршае адборачны цыкл, у якім ужо нічога «не свеціць». Я разумею, што зараз больш патрэбны клубу. Акрамя таго, маё рашэнне абумоўлена і сямейнымі абставінамі. Як вы ведаеце, 28 жніўня ў мяне ў Італіі нарадзіўся сын...».

РАМАНАЎ ЗНОЎ ТРЫМАЕ ЎДАР

Беларускі баксёр Юрый Раманаў зноў будзе абараняць тытул чэмпіёна Еўропы, на гэты раз у баі супраць італьянца Стэфана Дзофа.

Паядынак адбудзецца ў мінскім Палацы спорту 16 кастрычніка. На рынг таксама выйдзе сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Афінах Магамед Арыгаджыеў: ён выступіць у ролі прэтэндэнта на званне чэмпіёна СНД і славянскіх краін. Яго сапернік — расіянін Арцём Вычкін.

Простая мова

НЕСПРЫЯЛЬНЫ ЧАС ДЛЯ ЎСМЕШАК?

...Гадзіннік пясочны на вочы трапіўся. І нават не на хвільку — час быў паназіраць.

Цікавая, скажу вам, рэч!

Тым, прынамсі, што пясок, пакуль яго шмат, «выцякае» зусім непрыкметна, марудна-марудна. Затое потым, калі застаецца крыха, — хуценька-хутка, можна сказаць, кумільгом...

Гэтаксама, мусіць, жыццё? У маленстве, у юнацтве яно памалу «цячэ», нават хочацца, каб хутчэй, а потым...

Што, магчыма, цікава яшчэ (думала, гледзячы на пясок), дык гэта тое, што ён, быццам нашы набыткі — веды, уменні, вопыт..., — хоць у нейкай ступені ды ўсё ж «перацякае», «улiваецца» ў жыцці дзяцей.

Калі ж Бог іх не даў — проста «высыпаецца». З большага...

І тады (паводле класіка...) жыццё, як форма існавання бялковых цел, і насамрэч, сэнсу не мае.

Бо браты...

У сваяка на самым пачэсным месцы (гэта значыць, на крэсле за сталом) новы гадаванец сядзіць — чорненькі каток — з цікаўнымі вочкамі, з белымі пыскай, «манішкай» і такімі ж «тапкамі» на лапках.

Пагладзіць бы...

Але ж, як кажуць, трэба «культурне́й трохі быць» — павітацца з гаспадаром, распытаць у яго, як жыццё, што новага?

— Ды нічога, здаецца, — чухае патыліцу той. — Хіба во (паказвае на крэсла. — **Аўт.**) — яшчэ адзін рот у хаце.

Словы гэтыя «рот» пачуў і, здаецца, не пакрыўдзіўся. Хутчэй, наадварот — саскочыў з крэсла, хвосцікам падпёр нагу «кармільца». Быццам сказаў: «Ды не дрэйфь ты! Перакантуемся».

Не май сто рублёў...

Калі выходзіць з таго, што шчасце — гэта, калі ў цябе не маўчыць тэлефон, то ўжо каму-каму, а Яфімаўне можна зайздросціць, бо тэлефануюць ёй пастаянна — дачка, унук, былыя супрацоўнікі. Хоць яна і на пенсіі ўжо. Гадоў з 15... А помняць, бо добрым была бухгалтарам, а ўжо гаспадыняй... Ад Бога, як кажуць: усё чыста ўмела — пашыць, памыць, звязаць, зварыць...

Трэцяга дня да прыяцелькі свая́к на тыдзень прыехаў. Вегетарыянец — мяса не есць. І з малочнага нічога... Тая ў паніку, на тэлефон: «Яфімаўна, чым карміць, што варыць? Геркулес на вадзе? Як сабаку?»

Яфімаўна ёй меню склала. На ўвесь тыдзень... А магла б і болей.

У іх свая мова...

Чым больш мабільнікаў, тым меней таямніц. Пакуль еду з работы (вушы ж не заткнеш), чую, што адну з маіх спадарожніц запрасілі на вяселле, але не па-людску, таму яна — не пойдзе, у другой на вячэру — «голая» макарона сёння, бо «ў халадзільніку мыш павесілася», у трэцяй — хварэе дзіця, чацвёртая ж (падобна. — **Аўт**.) — заўтрашні дзень планавала, што гучала прыкладна так:

— А твой, чуеш, на дачу нас не падбросіць?.. Не?.. Ён сёчас у какую смену работаіць? У фтарую? Дык я тагды, можа, дочары сваей пазваню. Яе парань на машыне кайго-та возіць...

Мо і не дарэчы зусім?.. Сёлетні 2007-ы ў краіне-суседцы аб'яўлены годам рускай мовы. Гэта значыць, што ў абарону яе будзе шмат што зроблена. Там...

Грэшнай справай падумала, што яно б, напэўна, добра і тут, за межамі?

Мо, тады, як сякеру пад лаўкай (як, да прыкладу, паліва), мы «знайшлі» б уласную мову.

І ад гэтага (прычым, абедзьве яны!) толькі выйгралі б.

Але вопыт ёсць!

Пра гэты ласунак прыяцелька прачытала ў кніжцы і яшчэ зімой. А таму досыць доўга марыла, як настане лета і як тады — ёй — у прыгожы, шырокі фужэр, напоены халоднага паўсалодкага шампанскага. Як яна (ужо сама), маленькім відэльчыкам, адстаўіўшы пальчык, кіне туды пару-тройку вялікіх, чырвоных, спелых клубніц, як палюбуецца — пачакае, пакуль яны «апрануцца» ў белыя празрыстыя бурбалкі. І толькі потым, па адной, тым жа прыгожым відэльчыкам, яна будзе даставаць іх, смакаваць і запіваць віном...

Мары збываюцца (калі вельмі хацець)! У адзін з пагодных летніх вечароў у дзяўчыны з'явілася ўсё: цэлае вядзерца сакавітых спелых клубніц, ці не столькі ж — халоднага паўсалодкага шампанскага, добрая кампанія, музыка... Да таго ж ля вогнішча, ля ракі...

Адвяла душу...

Назаўтра — прызналася, што наколькі радасна, смачна, эстэтна ўсё гэта было ўвечары, настолькі ж гідка, горка і цяжка днём.

Але вопыт ёсць!

Два ў адным

У суседкі радасць: досыць доўга грошы збірала, але новую пралку — усё ж купіла. Выклікала майстра, каб падключыў, вывучыла інструкцыю, закінула тры камплекты пасцельнай бялізны, націснула кнопку.

Паслухала, як паслухмяна, як пакорліва загудзеў матор, як — без яе (аўтамат жа!) — «пайшоў працэс» і...

Колькі тая бялізна мылася, столькі гаспадыня... плакала.

Нябожчыца-маці яе (потым расказвала) дзве фермы трымала: адну — у калгасе, другую дома. Да таго ж — чацвёра дзяцей, выпівоха-муж. І ўсіх — дзень пры дні — накармі, абмый...

У ночвах замочвала, у чанах на пліце выварвала, рукамі мыла. Не разгіналася, бедная, за работай свету не бачыла. І ўжо не ўбачыць!

...Што для дочак не так крыўдна, можа, было б, калі б тую пральную машыну вынайшлі ўчора, а то ў... 1824 годзе.

Пасееш прывычку — пажнеш характар...

Вечар. Тралейбус — любімы... Бо вязе дамоў і нават без перасадак — па многіх, да болю знаёмых вуліцах, па прывычных...

Апроч, хіба што, адной? Пралягае яна між двума заводамі, у лагчыне. І таму — лічы, не прадзімаецца: чад там, смурод... Пакуль ***міма*** і едзеш...

А нехта ж — працуе. Дзень пры дні. Гадамі. Ці нават усё жыццё.

Прывыкае чалавек.

Ці гэта ад безвыходнасці, ад немагчымасці нешта змяніць?

Дзеля дзяцей

Лёс пакалення...

Дзяцінства іх забрала нялёгкая праца, юнацтва — вайна. Толькі і радасці было, што скончылася, што выжылі. Пажаніліся, замуж пайшлі...

Але многія — ненадоўга. Ігнатаўна, да прыкладу, толькі сем гадочкаў «там» пажыла, — памёр яе чалавек ад атрыманых ран. А дзяцей пакінуў.

Як ні цяжка было, — вырасціла, на ногі паставіла, вяселлі справіла, нават унукаў прыждала. Казала: «Усё — можна ўжо і паміраць».

Але так не выйшла, бо раптоўна, ні дня не хварэўшы, памерла... дачка, пакінула ёй двух хлопчыкаў.

І бабуля зноўку запрэглася: пасля асноўнай, настаўніцкай работы, на продаж смажыла семкі, вязала шкарпэткі, падпрацоўвала вахцёркай, прыбіральшчыцай. А калі і на гэту работу браць перасталі (зрок стаў падводзіць), пайшла бутэлькі збіраць, макулатуру, кардон — усё ж капейка...

Цяпер тыя сіроты выраслі, яна — састарэла зусім: ледзь кратаецца... Але ж на пахаванне сяброўкі дабралася-такі: адзін з унукаў на машыне прывёз — маладзенькі, досыць прыгожы.

...Цікава, ці разумее ён, што для яго, для іх зрабіла бабуля?

Клас не заўважыў...

Моваю лічбаў. У школах аднаго з райцэнтраў (нашых) анкетаванне правялі (само сабой — ананімнае). Малюнак — вочы б такіх не бачылі: 35 працэнтаў старшакласнікаў п'юць спіртное пастаянна, больш за палову — эпізадычна, 15 працэнтаў — з-за гэтага ўжо мелі непрыемнасці. Горш за тое, да чаркі прыкладалася каля 40 працэнтаў... пяцікласнікаў.

...Знаёмая настаўніца пісала, як вучань яе ля дошкі пераказваў сваімі словамі казку пра Машаньку. Гучала гэта прыкладна так: «Старыя пусцілі дзяўчынку ў хату, абагрэлі яе, накармілі, далі сто грамаў і паклалі спаць».

Што адметна: ніхто ў класе не ўсміхнуўся, лішніх слоў не заўважыў.

Ды і ці мог? Па сённяшнім часе...

Хочаш жыць — умей... схавацца

Праспект пад вокнамі ў тры радыабсадзілі каштанамі. Прыгожыя выраслі... Асабліва — вясной, калі зацвітаюць. Ці вось зараз...

Што цікава — з тых, што сядзяць за «спінамі» — гэта значыць, далей ад дарогі (у трэцім радзе) ніводзін ліст, лічы, яшчэ не апаў — прыгожыя стаяць, нават зялёныя.

Тыя ж, што «бралі ўдар на сябе»...

Сумнае відовішча...

Неспрыяльны час для ўсмешак

Яшчэ раз...

Прыяцелька, стаміўшыся разрывацца паміж домам, працай, маленькай унучкай, старэнькай маці і дачай, здалася — прынесла ладную кардонку з насеннем, сказала: «На, можа табе спатрэбіцца?»...

Напрадвесні вольная гадзінка была. Рашыла «рэвізію» зрабіць, перабраць запасы. У тым ліку з кардонкі.

Прыгожыя там пакецікі, акуратныя — ад цыгарэт, ад запалак. І на кожным — надпіс. Почырк, праўда, неразборлівы, але ж чытаць можна. Тут — «Астры «Седая дама» (гучыць як?!), тут — «Огурцы (очень ранние) «Отелло»», тут — «Помидоры от тети Веры», морковь «Чемпион»...

На чарговым пакеце нешта няўцямнае, доўгае. Начапіла акуляры, паднесла пад лямпачку, з трудам прачытала: «А пёс ёго знает, что это».

Хацела спытаць... Але паблізу сабак не было.

Так пасеяла — усмешку...

Ды, відаць, няўмеючы (не там, не тады)? Не ўзышла яна.

А мо, проста час цяпер неспрыяльны?.. Для усмешак.

Валянціна ДОЎНАР.

P.S. *Не мной заўважана: ледзь не ўсе размовы па «мабільніках» пачынаюцца з пытання: «Ты цяпер дзе?», завяршаюцца ж — кароткім, як стрэл: «Ну давай!».*

А што, уласна, даваць? І каму?..

У тых, хто гаворыць па-беларуску, замест гэтага і, згадзіцеся, досыць бязглуздага, гучыць аптымістычнае: «Ну, будзь!..». Ці: «Будзьма!».

Коратка. Ёмка. Ясна... Да таго ж — столькі выпіта...

То, калі ласка, будзьце (жывымі, здаровымі, дужымі...)!

І, безумоўна ж, будзьма! Разам. Як кажуць сябры-расіяне, «одно бревно и в печи не горит, а два — и в поле не гаснут».

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.18	18.17	11.19
Віцебск —	7.08	18.26	11.18
Магілёў —	7.08	18.27	11.19
Гомель —	7.03	18.25	11.22
Гродна —	7.33	18.53	11.20
Брэст —	7.32	18.55	11.23

Месяц

Апошняя квадра 3 кастрычніка.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Макара, Пятра, Фёдара;*
К. *Апалінара, Барталамея, Ігара.*

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+12 — +14 °C	МАСКВА	+10 — +12 °C
ВІЛЬНЮС	+9 — +11 °C	РЫГА	+10 — +12 °C
КІЕЎ	+13 — +15 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+11 — +13 °C

5 кастрычніка

1914 год — адбыўся першы ў гісторыі паветраны бой: у паядынку сышліся французскія і нямецкія аэрапланы.

1777 год — нарадзіўся Іосіф Аляшкевіч, беларускі жывапісец-партрэтыст. Закончыў Віленскую мастацкую школу, працаваў у майстэрнях французскіх мастакоў. Стварыў шэраг партрэтаў у стылі позняга класіцызму і рамантызму. Сярод іх — партрэты Л. Сапегі, М. Радзівіла, А. Чартарыйскага, А. Міцкевіча (з вялікім паэтам ён сябраваў). Памёр у 1830 годзе.

«Калі хтосьці ліжа табе падэшвы, хутчэй прыцісні яго нагой, перш чым ён пачне кусацца».

Поль Валеры (1871—1945), французскі паэт.

УСМІХНЁМСЯ!

Пасля нараджэння дзіцяці я зразумею 10 бясспрэчных ісцін:

1 — голас аднаго трохгадовага дзіцяці, якое крычыць, у тры разы гучнейшы за галасы траіх дарослых;

2 — усё, што захоўваецца ў недасягальным месцы, дастаецца за 28 секунд;

3 — губная памада мае нядрэнны смак, прычым чым больш яркая, тым больш смачная;

4 — цюбіка зубной пасты хапае на палову сценкі і дзверы;

5 — ад паласкання ў пральнай машыне хамяк ванітуе;

6 — парасон ніколі не заменіць парашут;

7 — самыя важныя дакументы рвуцца ў першую чаргу;

8 — у страўнік можа змясціцца тры вялікія порцыі марожанага, але ніколі — маленькая міска супу;

9 — суперклей клеіць сапраўды ўсё;

10 — пажарная прыязджае за 10 хвілін.

☺

Вадзіцель падыходзіць да механіка:

— Збіраюся ў далёкую паездку на машыне. Якія запчасткі трэба ўзяць для маёй ВАЗ 21099, каб у дарозе, калі што, можна было б адрамантаваць яе?

Механік (сур'ёзна задумаўся):

— Запісвай. ВАЗ-21099 запасны, 1 штука.

☺

Ці ведаеце вы, што калі мольсамка есць футра, яна плача гарачымі слязьмі?

☺

— Як зрабіць, каб мужчына ў ложку проста звар'яцеў?

— Адабраць у яго пульт ад тэлевізара.

Фота Васіля ЗЯНЬКО.

ЧЫЙ БАЙЧЭЙШЫ?

Погляд

ЗАНАДТА АСЦЯРОЖНЫ ЗАКОНАПРАЕКТ?

Набліжаецца парламенцкае абмеркаванне праекта закона аб правапісе.

Яшчэ летась праект трапіў пад крытыку. Вядома, вялікую яе частку, выказаную «правапіснай апазіцыяй», не варта прымаць усур'ёз — гучней за клопат пра мову там гаворыць ідэалогія. Зразумела, што нявыпраўленыя праблемы ў нарматыўнай правапіснай сферы толькі на руку тым, хто прапагандуе свой уласны, «палітычна правільны» моўны прадукт, так званую «тарашкевіцу». Аднак ёсць і рацыянальныя моманты ў крытыцы праекта і працэдуры яго прымання.

Найперш, дасюль не растлумачана выразна, навошта спатрэбілася прымаць папраўкі да нарматыўнага правапісу законам праз Парламент. Калі гаворка пра ліквідацыю «моўнага разнабою» ў маштабе краіны, то ніякі законапраект тут не дапаможа. Адносіны шараговых удзельнікаў «правапіснай апазіцыі» да гэтак званай «тарашкевіцы» даўно ператварыліся ў своеасаблівую рэлігійнасць, у ідэалагічны культ. А вядома ж, якой бесперспектыўнай, а то і немагчымай, з'яўляецца «барацьба з ідэямі». Спробы прымусіць выконваць такі законапраект — «загадваць як гаварыць», як кажуць крытыкі — прывядуць толькі да «страты аблічча» ўлады. Бадай, дастаткова было б замацаваць законам сферы дзейнасці, дзе патрабуецца выкарыстанне моўнага нарматыву.

Бо прапанаваны законапраект, на добры лад, нічога важкага ў правапісе не мяняе, а гэта значыць, што крытыка супраць яго — у значнай ступені надуманая і ідэалагізаваная, але таксама гэта значыць, што засталіся некранутымі пэўныя праблемы нашай граматыкі, якія здавён дужа перашкаджаюць у выкрокім засваенні і выкарыстанні беларускай мовы, і, фактычна, шкодзяць яе аўтарытэту.

І напэўна, значна больш дзейсным сродкам умацавання становішча беларускай мовы магло б быць рашучае ўдасканаленне акадэмічнага правапісу, якое адразу ішло б далей, чым прадугледжвае законапраект.

Гэты тэкст кажа пра два такія змяненні — ліквідацыю правапіснага падзелу слоў на «беларускія» і «іншаземныя» і вяртанне некалькіх асаблівасцяў словазмянення, прынамсі часткова, у іх дарэформенны выгляд. Закранаецца і пытанне правапісу складаных слоў, якое таксама пакуль што не знаходзіць рацыянальнага развязання.

СЛОВЫ «СВАЕ» І «НЕ СВАЕ»

Гаворка найперш пра тое, што наш акадэмічны правапіс, хоць і слушны ў сваёй аснове, але ўсё яшчэ захоўвае закладзены ў яго яшчэ Тарашкевічам прынцып падзелу слоў на «свае» і «іншаземнага паходжання» — іначай гэта называецца «перадачай запазычаных слоў як мага бліжэй да мовы-арыгінала».

Навошта так было прыдумана Тарашкевічам, няхай разбіраюцца гісторыкі. Магчыма, гэта мела сэнс у часы неразвітой і нявывучанай мовы і небагатага выбару «мовы-арыгінала» (польская або руская). Для нас мае значэнне тое, што ў наш час гэта выглядае недарэчна, і карыстацца гэтым нязручна — у адным слове Е пераходзіць перад націскам у Я, у іншым — не; у адным слове нельга ўжываць Э без націску, у другім — можна; тут правадзім У ў Ў, а тут — не; тут правадзім ТСК у ЦК, а тут не; слова «іншаземнае» (хіба «панскае»?), слова «засвоенае даўно» і «засвоенае нядаўна»?!

У дадатак, гэты прынцып дазваляе ў палітычных мэтах уводзіць у мову неўласцівыя ёй фанетычныя якасці — і рускія, пад выглядам «жадання носьбітаў імёнаў», ці польскія, пад выглядам «класічных правапісаў». А гэта і фізічна немагчыма для жывой мовы — быць міжнародным фанетычным алфавітам, дый не дужа пачэсна. А ў канчатковым выніку ўскладняецца засваенне і ўжыванне правапісных правілаў, шмат падобнага пішацца па-рознаму.

Вядома ж, існуе «традыцыйны» акадэмічны аргумент за такі падзел, і ён гучыць так, што існуе літаратурная традыцыя, і трэба толькі запомініць словы ці праверыць у слоўніку. Аднак, у наш час гэты аргумент страціў сваю сілу, бо, па-першае, беларускамоўная супольнасць сутыкнулася адразу з небывалай колькасцю новага слоўнага запасу, а па-другое, таму, што сфера ўжывання беларускай мовы ў апошнія гады скарачаецца, а значыць, нармальная, натуральная традыцыя не выпрацоўваецца. У гэтых акалічнасцях патрэбныя простыя і рацыянальныя правілы, заснаваныя на моўнай сістэме беларускай мовы — а гэтакіх правілаў пакуль што не відаць.

ІНШАЗЕМНЫЯ НАЗВЫ

Значнай часткай гэтай праблемы з'яўляецца задача транскрыпцыі замежных назваў, якую зараз таксама робяць «хто як чуе» і «хто як хоча», балазе прынцып падзелу слоў на свае і недатыкальныя дазваляе гэтакую сваволю. І выходзяць лексікаграфічныя і энцыклапедычныя выданні, дзе раптам — дамо толькі пару прыкладаў — Еўклід робіцца Эўклідам, або дзе ёсць на выбар і Еўфрасіння, і Эўфрасіння.

На жаль, у акадэмічных матэрыялах з гэтым таксама нядобра, і прыкрытыя «традыцыяй», там таксама трываюць пэўныя неўласцівыя беларускай фанетыцы з'явы, напрыклад, звышскладаныя правілы пачаткавых ётаваных галосных і іх збегаў і іншае.

Дык ці не пара развітацца з прынцыпам «падзелу слоў», і зрабіць асновай тое, што слова, якое трапіла ў кантэкст беларускай мовы, падпарадкоўваецца яе правілам (аканне і яканне, сцяжкі зычных і інш.) нароўні з іншымі словамі, незалежна ад паходжання?

Так, застануцца выняткі, як у кожнай жывой мове, але гэта будуць менавіта нешматлікія выняткі, якія не будуць выводзіцца ў сістэму. Добра тое, што пачаткі такога руху былі пакладзеныя даўно, часткова гэта ажыццяўляецца ў акадэмічным правапісе мінімум з 1959 года, і фактычны характар змянення — не рэвалюцыйны, а эвалюцыйны.

СКЛАДАНЫЯ СЛОВЫ

Варта было б больш рашуча спрасціць і правапіс складаных слоў. На думку аўтара, складаныя словы, якія бываюць вельмі доўгімі, маглі б абысціся без сённяшняга правіла на вылічанне — «а дзе ж націск у другой частцы слова»? Думаецца, беларускасць мовы не пацярпела б, калі б для складаных слоў было дазволена захоўваць націскі ва ўсіх частках.

СЛОВАЗМЯНЕННЕ

Тут варта сказаць колькі слоў і аб словазмяненні (марфалогіі), хоць яно і не з'яўляецца часткай уласна правапісу. Вядома, што рэформа 1933 года мяняла і словазмяненне, і ў папраўках 1959 года гэтага не краналі. Дык вось, дапускаючы, што гэта рабілася сапраўды ў мэтах «аблягчэння засваення беларускай мовы масамі», час, відаць, прызнаць і тое, што тымі менамі было зроблена больш шкоды, чым карысці. Было ўведзена неўласцівае мове — і ўскладніліся правілы, і для ідэолагаў з'явілася лішняя нагода для крытыкі. Варта было б дапусціць як варыянты нормы (калі ўжо не вярнуць у дарэфарменны выгляд) некаторыя з гэтых правілаў марфалогіі, а прынамсі два з іх, якія найбольш «рэжуць вока», і акадэмічная крытыка супраць якіх самая слабая.

Гаворка пра 1) флексію -оў у родным склоне множнага ліку: словы—слоў/словаў, мовы—моў/моваў, і пра 2) змяненні прынцыпаў выкарыстання флексій -а/-у роднага склону адзіночнага ліку.

ЧАМУ ГЭТА ПАТРЭБНА

Зразумела, што такога роду прапановы не спатрэбіліся б, калі б усё ў нас з мовай было ў парадку, калі б існавала моцная традыцыя. На жаль, гэта не так. Ад самага Першага Адраджэння (г.зн. з 1900-х гадоў) мова трапляе папераменна пад суседскія ўплывы, інтэлігенцыя кідаецца за рознымі ідэалагічнымі міражамі. Таму і даводзіцца, каб ратаваць становішча, звяртацца вось да такіх пратэзаў саладраўдняй моўна-культурнай традыцыі.

Аўтар гэтага тэксту не прэтэндуе на неамыльнасць, але пры складанні стараўся трымацца шырокавядомых і непалітычных палажэнняў беларускай і мовазнаўчай навукі.

Юры ТАРАСЕВІЧ,
па адукацыі радыёфізік.
г. Гродна.

У суд Баранавіцкага раёна і горада Баранавічы паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Гаўрыліка Ігара Васільевіча,** 23 верасня 1968 года нараджэння, ураджэнца г. Івацэвічы Брэсцкай вобласці, які адбываў пакаранне ў ПУАТ № 1 пры Бяроза́ўскім РАУС Брэсцкай вобласці з 7 чэрвеня 2000 года і 16 мая 2003 года без дазволу пакінуў размяшчэнне ўстановы.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Гаўрыліка І.В., паведаміць іх суду Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Утерянный бланк Белгосстраха страхового свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серия АД № 1367722 **считать недействительным.**

Печать садоводческого товарищества «Чайка» Минский район ***считать недействительной.***

Згубленае пасведчанне інваліда II групы серыі 09 № 041825 на імя Барушка Ірыны Генадзьеўны **лічыць несапраўдным.**

Ноў-хаў

КАМФОРТ У ХАЛАДЗІЛЬНІКУ,

альбо Як падоўжыць «тэрмін жыцця» прадуктаў?

Вам калі-небудзь даводзілася выкідаць з халадзільніка сапсаваныя прадукты? Шкада, праўда? А змагацца з непрыемным пахам, ад якога няма паратунку? Калі вы з'ядаеце ўсё, што набылі і прыгатавалі адразу, альбо карыстаецеся дарагімі вакуумнымі кантэйнерамі (а-ля «Zepter») — гэты артыкул не для вас. Астатнім раю азнаёміцца з распрацоўкай беларускіх вучоных, якія прапанавалі свой спосаб ліквідацыі непрыемнага паху і падаўжэння «жыцця» прадуктаў у халадзільніку.

Прынамсі, нашы суайчыннікі былі не першымі, хто звярнуў увагу на азначаныя праблемы. У свеце сёння ёсць некалькі спосабаў іх вырашэння. Самы прымітыўны — выкарыстанне адсарбенту, які проста «паглынае» пах. Зараз у продажы ёсць прыстасаванні польскай вытворчасці, якія працуюць менавіта па гэтым прынцыпе. Дрэнны пах у халадзільніку атрымліваецца ў выніку жыццядзейнасці мікраарганізмаў, якія «жывуць» на нашых прадуктах. «Польскі» спосаб не выдаляе прычыну паху (мікраарганізмы), а ўстараняе толькі следства (сам пах). У выніку: у халадзільніку не пахне, аднак прадукты псуюцца са звычайнай для іх у такіх умовах хуткасцю.

Больш перадавы спосаб — «італьянскі». Іх прыбор — азанатар — заснаваны на прынцыпе электрахімічнага ўтварэння азону. Як мы ведаем з курса школьнай хіміі, азон — гэта няўстойлівая «камбінацыя» трох атамаў кіслароду, якія пры разбурэнні ўтвараюць малекулу кіслароду і атам кіслароду (так званы «актыўны кісларод», здольны ўступаць у хімічныя рэакцыі акіслення). Азон знішчае мікраарганізмы. У выніку: у халадзільніку няма дрэннага паху, прадукты даўжэй захоўваюцца свежымі. Вось толькі ёсць нюанс: «актыўны кісларод» прыводзіць да хуткага акіслення ў першую чаргу тлушчаў, а значыць, тое ж сметанковае масла ці тлустая рыба ў вашым халадзільніку будуць хутка прагаркаць і станавіцца шкоднымі для здароўя.

Найбольш удалай да апошняга часу з'яўлялася распрацоўка японскіх вучоных. Яны прымянілі самы экалагічна чысты, эфектыўны і бяспечны для здароўя спосаб, які грунтуецца на выкарыстанні расліннай сыравіны. Агульнавядома, што некаторыя расліны «ўтвараюць» лятучыя злучэнні з моцнымі антысептычнымі якасцямі (фітанцыды), якія знішчаюць шкодныя мікраарганізмы. Японцы ў сваіх прыстасаваннях выкарыстоўваюць асаблівы гатунак хрэну, які расце выключна на Японскіх астравах. Іх антысептычныя прыборы каштуюць шмат і ўжо ператварыліся толькі ў дарагія японскія халадзільнікі.

Адно беларускае прадпрыемства (лідар па вытворчасці халадзільнікаў у краіне) заказала нашым вучонym распрацаваць аналаг японскага прыстасавання, толькі з выкарыстаннем таннай айчыннай сыравіны. Паралельна з гэтым на самім прадпрыемстве вядуцца іспыты «японца» прымяняльна да беларускіх бытавых халадзільнікаў. Іх вынікі паказалі неэфектыўнасць гэтага прыстасавання і ад усіх распрацовак у «фіта» накірунку адмовіліся. Даследаванні згарнулі. Усё б гэтым і скончылася, калі б не дапамога прыватнага капіталу. Прадстаўнікоў беларускага бізнэсу ідэя стварэння антысептычнага сродку для захоўвання харчовых прадуктаў з выкарыстаннем айчыннай сыравіны зацікавіла. Яны прафінансавалі праект і сёння можна смела гаварыць аб яго паспяховых выніках.

— Мы вынайшлі сыравіну, якая не саступае японскай у эфектыўнасці і адначасова з'яўляецца значна таннейшай, бо яна — мясцовага паходжання, — патлумачыў нашаму карэспандэнту **загадчык кафедры біятэхналогіі і біяэкалогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, кандыдат хімічных навук, дацэнт Віктар ЛЯВОНЦЬЕЎ.** — У беларускіх халадзільніках японскае антысептычнае прыстасаванне было неэфектыўным з-за таго, што ў іх няма асобнага адсека для садавіны. Наш прэпарат распрацаваны з улікам асаблівасцяў тавараў айчыннай вытворчасці. Ён экалагічна чысты, бяспечны для здароўя, эфектыўны. Акрамя таго, наша распрацоўка мае больш шырокі, чым у японцаў, спектр прымянення і можа выкарыстоўвацца не толькі ў халадзільніках, але і ва ўсіх кухонных шафіках, кантэйнерах і ў іншых закрытых аб'ёмах, дзе захоўваюцца прадукты харчавання. Лятучыя кампаненты прэпарата знішчаюць шкодную мікрафлору (грыбы, дрожджы, бактэрыі), сам ён не выдзяляе таксічных рэчываў, не мае рэзкага паху. Мы ўжо даказалі відавочны антысептычны эфект нашай расліннай сыравіны ў лабараторных умовах. Цяпер пераходзім да іспытаў «на натуры», каб прадэманстраваць яе эфектыўнасць у халадзільніках.

У тым, што вынікі гэтых іспытаў будуць станоўчымі, Віктар Мікалаевіч не сумняваецца:

— Свежая, якасная рыба, якую мы набылі ў магазіне, можа захоўвацца ў сырым выглядзе ў халадзільніку (без замарозкі) прыблізна суткі. З выкарыстаннем нашага прыстасавання — у 2—3 разы больш. Вельмі хутка псуецца садавіна, скажам, вінаград. Гэта абумоўлена тым, што на паверхні ягад заўсёды ёсць грыбная мікрафлора. Калі цэльнасць скуры парушаецца і сок (у якім ёсць цукар) выходзіць на паверхню, пачынаецца хуткі рост грыбоў і дрожджаў. Пры 2—3 сутак на ягадах бачна цвіль. Наша распрацоўка падоўжыць тэрмін захоўвання вінограду да 6—7 сутак.

Прадстаўнікі беларускага прыватнага капіталу, якія прафінансавалі даследаванні навукоўцаў, натуральна, зацікаўлены ў хутчэйшым увасабленні распрацовак у канкрэтны тавар. Паводле слоў Віктара Мікалаевіча, на паліцах нашых магазінаў можна будзе знайсці антыбактэрыяльны сродак для захоўвання харчовых прадуктаў беларускай вытворчасці літаральна праз 5—6 месяцаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

5

КАСТРЫЧНІКА
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 41 (15492)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Твае правы

«АДПРАЦОЎКА» з асаблівым статусам

Літаральна штогод дыпломы аб адукацыі атрымліваюць дзесяткі тысяч грамадзян нашай краіны, прычым пераважная большасць з іх набывае статус маладых спецыялістаў. Між тым не сакрэт, што прадстаўнікі гэтай катэгорыі маюць не толькі пэўныя абавязкі, але і адначасова — дадатковыя правы. Як маладому спецыялісту вырашыць вядомае «жыллёвае пытанне», ці павінны яны праходзіць стажыроўку, у якіх выпадках магчыма або немагчыма іх звальненне, нарэшце, якія льготы і гарантыі ўчарашнім выпускнікам вызначае заканадаўства? Аб усім гэтым і іншым наша гутарка з галоўным прававым інспектарам працы Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Соф'яй Васільеўнай ГРЫШУЦІНАЙ.

Сваё жыллё — свая чарга

Першая і, напэўна, галоўная праблема для значнай часткі ўчарашніх студэнтаў, якія накіраваліся працаваць па размеркаванні, датычыцца жылля. Ці абавязаны па першаму працоўнаму месцу прадаставіць прынамсі інтэрнат? І што рабіць у выпадку, калі ўласнага інтэрната ў той ці іншай арганізацыі проста няма?

— Калі ў арганізацыі няма ўласнага інтэрната, то яго сапраўды могуць не прадаставіць, — адзначае Соф'я Грышуціна. — Таму адзінае выйсце ў такой сітуацыі — папрасіць наймальніка пахадайнічаць аб пасяленні ў інтэрнат іншых прадпрыемстваў ці ўстаноў. Аднак, зразумела, што гэта хадайніцтва могуць як задаволіць, так і не задаволіць. Разам з тым тут трэба мець на ўвазе наступнае. Згодна з Палажэннем аб размеркаванні выпускнікоў, што нарыхтоўваюцца ў сістэме Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, маладыя спецыялісты, якія прыбылі на работу згодна з размеркаваннем, могуць быць накіраваны на работу ў іншую мясцовасць, калі ў ліку патрэбных ім спецыяльнасцей няма вакантных пасад. Такім чынам, калі ў выпускніка няма магчымасці атрымаць жыллё ў месцы размеркавання, ён можа ўзяць на ўлік па месцы сваёй пастаяннай прапіскі і праз пэўны час (звычайна гэта 2—3 гады) разлічваць на атрыманне жылля.

Да таго ж калі малады спецыяліст адносіцца да катэгорыі малазабяспечаных грамадзян (у прыватнасці, калі даход на кожнага члена яго сям'і не перавышае двух бюджэтаў пражыткавага мінімуму ці на сёння — 565 260 рублёў), то ўзнікае права на атрыманне ў парадку чаргі льготных крэдытаў, субсідый і іншай дзяржаўнай падтрымкі на будаўніцтва ці куплю жылля. Пры гэтым чарга на прадастаўленне такіх крэдытаў і субсідый вядзецца ў выканкаме.

Нарэшце, таксама важны нюанс. Калі арганізацыя мае ўласнае жыллё або вядзе будаўніцтва, то малады спецыяліст можа быць прыняты ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў па месцы працы. І, да слова, у такім выпадку парадак прыняцця на ўлік, ільготы маладым спецыялістам па чарзе, умовы выдзялення пазык і крэдытаў вызначаецца ў калектыўным дагаворы. Аднак калі ў арганізацыі жылля няма і яна не вядзе будаўніцтва, то стаць на ўлік магчыма толькі ў выканкаме па месцы прапіскі ці з новага года — па месцы рэгістрацыі.

Стаж. Але агульны

Як вядома, перад прыходам на першае месца малады сацыяліст праходзіць прафесійную падрыхтоўку. Аднак ці ўключаецца час навучання ў «асобны» стаж, што дае права на надбаўкі за работу па спецыяльнасці?

— Падставай для прызначэння даплат за стаж работы па спецыяльнасці час навучання не з'яўляецца, — тлумачыць Соф'я Грышуціна. — Таму, як правіла, перыяд навучання ўваходзіць толькі ў агульны стаж, які бярэцца пад увагу пры разліку пенсій.

Дзе дагавор, там абавязкі

Не менш распаўсюджаныя пытанні. Якую работу можна адразу даручаць маладым спецыялістам, якія, як кажуць, яшчэ не ўвайшлі ў курс новай справы? Ці ёсць на прадпрыемствах такое паняцце, як стажыроўка? І ці могуць маладога спецыяліста пазбавіць прэміі з-за таго, што з прычыны малога вопыту ён не здолеў выканаць даручэнне кіраўніцтва?

— Такое паняцце, як стажыроўка вызначана толькі для асобных катэгорый маладых спецыялістаў, такіх, як медыцынскія работнікі, пракурорскія работнікі ці суддзі, — адзначае Соф'я Грышуціна. — У той жа час для астатніх стажыроўка не прадугледжваецца. Адпаведна, калі малады спецыяліст падпісвае працоўны дагавор, ён адразу ж бярэ не сябе абавязкі выконваць пэўныя службовыя абавязкі і несці адказнасць за іх выкананне. Таму невыкананне пэўнай задачы ці службовая памылка дае падставу наймальніку для выкарыстання мераў дысцыплінарнага спагнання. І ў тым ліку, падставу аб'явіць заўвагу, вымовupadзабавіць прэміі.

Пратэрміноўка — не прычына

Пасля прыбыцця да наймальніка па размеркаванню з выпускніком ВНУ ці ССНУ, як правіла, заключаецца працоўны дагавор на няпэўны тэрмін. Аднак па дамоўленасці бакоў тут можа заключацца і кантракт. Тады тэрмін такога кантракта з выпускнікамі ВНУ і ССНУ не павінен быць меншым за два гады, а з выпускнікамі прафтэхвучылішча — меншым на год. Гэта аксіёма. Тым часам, ці могуць працоўныя адносіны спыніцца раней за заканчэнне гэтага часу?

— Такая верагоднасць існуе, — кажа Соф'я Грышуціна. — У прыватнасці, працоўны дагавор ці кантракт могуць быць датэрмінова скасаваныя пры ліквідацыі арганізацыі, у выпадку неадпаведнасці займаемай пасадзе на стане здароўя, а таксама ў выпадку парушэння маладым спецыялістам працоўнай дысцыпліны.

Адначасова варта заўважыць, што звольніцца па ўласным жаданні да заканчэння тэрміну неабходнай «адпрацоўкі» ў маладога спецыяліста не атрымаецца — у адваротным выпадку ён будзе абавязаны кампенсаваць выдаткі на сваё навучанне. Прычым у дадзеным выпадку немагчыма звальненне і з прычыны затрымак зарплаты. У такіх варунках малады спецыяліст можа толькі звярнуцца ў суд або дзяржаўную інспекцыю працы з тым, каб прыцягнуць наймальніка да адказнасці. Дарэчы, сама адказнасць за падобнае парушэнне ў хуткім часе стане больш строгай. Так, з 26 студзеня (даты ўступлення ў сілу новага варыянту Працоўнага кодэкса) за несвоечасовыя разлікі па зарплаце прадугледжваецца скасаванне кантракта з наймальнікам.

Прагулы вызвалення не даюць

Нялішне заўважыць, што ў тэрмін абавязковай «адпрацоўкі» ўваходзіць час службы ў арміі. Інакш кажучы, у выпадку прызыву маладога спецыяліста на паўтара года, ён можа дапрацаваць па размеркаванні толькі 6 месяцаў.

У той жа час, заўважае Соф'я Грышуціна, да варыянтаў скарачэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі трэба падыходзіць вельмі асцярожна. Адзін з прыкладаў. Малады спецыяліст прыязджае па размеркаванню. Але потым проста не выходзіць на працоўнае месца — з недвухсэнсоўным разлікам на звальненне за прагул...

— Звальненне за парушэнне працоўнай дысцыпліны на працягу вызначанага тэрміну адпрацоўкі, як і нез'яўленне па размеркаванні, цягне за сабой неабходнасць кампенсацыі выдаткаў на навучанне, — падкрэслівае Соф'я Грышуціна. — Пры гэтым на працягу 3 дзён пасля звальнення за парушэнне працоўнай дысцыпліны кіраўнік арганізацыі абавязаны паведаміць аб гэтым у навучальную ўстанову. А ў сваю чаргу навучальная ўстанова — зрабіць паведамленне ў пракуратуру, якая зойме пошукам маладога спецыяліста.

Ільготы. І ўмовы

Асобная і даволі папулярная тэма — ільготы і гарантыі маладым спецыялістам. Таму варта спыніцца на іх больш падрабязна.

— Пры паступленні на работу згодна з размеркаваннем выпускнікам ВНУ і ССНУ павінны выплачвацца «пад'ёмныя» ў памеры месячнай стыпендыі, а выпускнікам дзённай формы навучання ПТВ — «пад'ёмныя» ў памеры тарыфнай стаўкі па набытай кваліфікацыі ці адпаведнага акладу, — распавядае Соф'я Грышуціна. — Далей. Маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія накіроўваюцца ў сельскагаспадарчыя арганізацыі, на працягу першых двух гадоў работы робіцца дадатковая даплата ў памеры адной «бюджэтнай» тарыфнай стаўкі I разраду. Нарэшце, нельга абысці ўвагай наступны момант: пэўныя даплаты і гарантыі могуць быць вызначаны ў кожным асобным рэгіёне.

Некалькі слоў аб гарантыях пры накіраванні ў іншую мясцовасць. Па-першае, у такім выпадку маладому спецыялісту і членам яго сям'і кампенсуецца кошт самастойнага праезду, выдаткі на перавоз маёмасці з разліку да 500 кілаграмаў непасрэдна на маладога спецыяліста і да 150 кілаграмаў — на кожнага члена сям'і. Па-другое, за час знаходжання ў дарозе робіцца выплата сутачных — у памерах, вызначаных для службовых камандзіровак. Па-трэцяе, па новым месцы працы маладому спецыялісту выплачваецца дапамога ў памеры яго будучай тарыфнай стаўкі ці акладу. А на кожнага члена сям'і робіцца выплата ў памеры 25 працэнтаў дапамогі маладога спецыяліста. І па-чацвёртае. Выпускнікам, якія накіроўваюцца ў іншую мясцовасць, на час збораў ў дарогу, пераезду і ўладкавання на новым месцы робяцца выплаты выходзячы з яго будучых тарыфнай стаўкі ці акладу, аднак не больш чым за 6 дзён.

Дзеля справядлівасці, тут жа трэба зрабіць вельмі істотныя агаворкі. Усе пералічаныя выплаты не робяцца выпускнікам-«бюджэтнікам», якія атрымалі права на самастойнае працаўладкаванне. А права на кампенсацыю за пераезд не маюць маладыя спецыялісты, якія вяртаюцца на сваё ранейшае месца жыхарства.

І яшчэ адзін нюанс. Як заўважае Соф'я Грышуціна, маладыя людзі, што навучаліся за кошт уласных сродкаў, могуць звярнуцца ў камісію размеркавання з просьбай накіраваць на работу ў пэўную арганізацыю. Разам з тым статусу маладога спецыяліста «платнікі» мець не будуць. Адпаведна, яны не абавязаны прытрымлівацца патрабавання аб абавязковай адпрацоўцы. Аднак у той жа час яны і не маюць магчымасці карыстацца ільготамі.

Сяргей ГРЫБ.

Лідарскі дар

РЫХТУЕМ КІРАЎНІКОЎ!

З тым, што за моладдзю — будучыня, мала хто будзе спрачацца. Каб тую будучыню зрабіць як мага больш светлай і паспяховай, патэнцыяльных кіраўнікоў рыхтуюць ужо зараз — у Школе маладога лідара. Праект пачынаўся на лакальным узроўні — для студэнтаў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а з 2005 года выйшлі на гарадскі маштаб, аб'ядналіся самых актыўных студэнтаў сталічных ВНУ. Курыруе праект Святлана Валахановіч, кандыдат педагагічных навук, дырэктар Цэнтра сацыяльна-псіхалагічнай работы Інстытута дзяржаўнага кіравання (структурнага падраздзялення Акадэміі кіравання), з ёю мы абмеркавалі праблемы лідарства, здабыткі і памкненні маладых людзей, асаблівасці іх навучання.

— Вопыт Школы маладога лідара ў Акадэміі кіравання быў пазітыўны, меў грамадскі рэзананс, да таго ж, выйшаў прэзідэнцкі ўказ № 354 «Аб рабоце з кіруючымі кадрамі ў сістэме дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый», які прадугледжвае і працу з перспектыўным кадравым рэзервам — студэнтамі, што патэнцыяльна могуць стаць кіраўнікамі, — тлумачыць Святлана Аляксандраўна. — Станіслаў Князеў, рэктар Акадэміі кіравання, ідэяй навучання лідараў зацікавіўся, а супрацоўнікі Цэнтра выхаваўчай працы і моладзевых ініцыятыў прапанавалі арганізаваць навучанне такіх маладых людзей — разаслалі адпаведныя запыты рэктарам розных ВНУ і паводле іх рэкамендацыі набралі самых актыўных студэнтаў, многія з якіх працавалі ў прафкамах і іншых студэнцкіх аб'яднаннях.

Для будучых кіраўнікоў была падрыхтавана спецыяльная праграма, якая ўдасканальваецца штогод, не ў апошнюю чаргу і дзякуючы самім студэнтам.

— Мы цікавімся іх інтарэсамі, прыслухоўваемся да іх пажаданняў, — зазначае Святлана Валахановіч, — праводзім сацыялагічныя апытанні і ў адпаведнасці з гэтым вызначаем накірункі ўласнай дзейнасці ў фарміраванні тэарэтычных і практычных аспектаў навучання.

Школа маладога лідара пачынаецца з самапазнання: як жа ўплываць на іншых, калі не здолеў разабрацца ў сабе? У далейшым актывістаў вучаць кіраваць сабой, сваім часам і, вядома ж, іншымі людзьмі.

— Лідары вучыліся ў малых групах, у кожнай з іх была асобная тэматыка ў адпаведнасці з інтарэсамі ўдзельнікаў. Вывучалі асаблівасці працы з інфармацыйнымі патокамі, канфлікталогію (як не давесці да сутыкнення, а калі не ўдалося, то як яго ўрэгуляваць), імідж кіраўніка, асаблівасці стварэння каманды і кіравання персаналам, — кажа Святлана Аляксандраўна. — Калі ў Акадэміі кіравання студэнты атрымліваюць гэтыя веды на спецпрадметах, то ў іншых ВНУ толькі закранаюць некаторыя аспекты ў курсе псіхалогіі, а многім гэтай інфармацыі не хапае.

У школе лідара было ўжо два выпускі:

— У першым наборы вучыліся 62 чалавекі — студэнцкі актыў 15 універсітэтаў, — успамінае Святлана Аляксандраўна, — ну а ў другім да нас завітала ажно 168 студэнтаў з 19 ВНУ, сертыфікаты атрымалі 96 з іх — тыя, хто здолеў падрыхтаваць і абараніць уласны праект.

У Школе лідара распрацавалі алгарытм падрыхтоўкі праектаў, згодна з якім усё павінна быць пралічана да дробных дэталяў, у тым ліку і фінансавае забеспячэнне. Цікава, што праекты многіх юнакоў і дзяўчат не супадалі з іх непасрэднай спецыяльнасцю ва ўніверсітэце: студэнт БДУІР Павел Аліш прапанаваў пуцевадзіцель па Глыбочыне (адкуль ён родам) пад назваю «Глыбоцкае скрыжаванне», ці вось яшчэ — лінгвіст распрацаваў праграму комплекснай падтрымкі састарэлых.

Рознасць універсітэтаў і спецыяльнасцяў садзейнічала ўзаемабагачэнню, нават нарадзіўся праект «Студэнт навучае студэнта», які аб'яднаў студэнтаў радыётэхнічнага і лінгвістычнага ўніверсітэтаў — знаўцы процілеглых галін ведаў навучалі адзін аднаго, ацэньвалі паказчыкі паспяховасці. Ды і многія іншыя прапановы засталіся не толькі на паперы: студэнткай БНТУ Анастасіяй Арабей быў створаны сайт моладзевай навукі, у адной з мінскіх школ рэалізавалі праграму прафілактыкі карыесу ў школьнікаў, распрацаваную студэнтамі-медыкамі, былі здзейснены разнастайныя акцыі ў рамках праекта «Кошт дзіцячага жыцця», скіраванага на падтрымку дзяцей з захворваннямі нырак і прапанаванага студэнтамі медыцынскага і педагагічнага ўніверсітэтаў, а таксама Вышэйшага радыётэхнічнага каледжа. Іх распрацоўка заняла першае месца на гарадскім конкурсе моладзевых праектаў.

— Мысленне ў нашых навучэнцаў грамадзянскае, — дзеліцца сваімі назіраннямі Святлана Аляксандраўна, — яны мабільныя, разумныя, да іх варта прыслухоўвацца. І калі кажуць пра тое, «якая моладзь пайшла», магу сказаць толькі адно — класная ў нас моладзь!

З класнай моладзі і лідары класныя атрымаюцца, дарэчы, у хуткім часе плануецца запусціць новы праект «Мінская змена: Лідар-2008» сумесна з Цэнтральным Камітэтам БРСМ, мабыць, пры падтрымцы чыноўнікаў...

— Пакуль што ідуць перамовы, — адзначае Святлана Валахановіч, — навучанне пачнецца не раней за снежань, каб нашы лідары паспелі здаць сесію. Да гэтага часу працы хопіць: трэба ж вырашыць столькі арганізацыйных момантаў — правесці адбор, анкетаванне студэнтаў, сацыялагічнае даследаванне, сфарміраваць педагагічны склад.

Школа маладога лідара ўжо абзавялася ўласным «белым» спісам — банкам даных самых перспектыўных студэнтаў і іх праектаў.

— Хацелася б не страціць той вопыт, які ўжо назапашаны, — кажа Святлана Аляксандраўна, — і выпусціць выданне для шырокага карыстання, у якім былі б зафіксаваны ўсе праекты, хацелася б, каб ідэі таленавітых дзяўчат і хлопцаў былі ўспрыняты хоць бы на ўзроўні тых ВНУ, студэнтамі якіх яны з'яўляюцца.

Ала МАЧАЛАВА.

Ведай нашых!

Беларусам няма роўных у хуткасці тэлеграфіі

Беларуская зборная стала першай у хуткаснай тэлеграфіі на VII чэмпіянаце планеты ў сербскім Бялградзе, дзе за ўзнагароды змагалася звыш 150 спартсменаў 19 краін.

Прадстаўнікі нашай рэспублікі заваявалі 43 медалі з 47 магчымых (палова найвышэйшай якасці). Абсалютным чэмпіёнам свету сярод мужчын у пяты раз стаў магіляўчанін Андрэй Біндасаў, на рахунку якога рэкорд свету ў перадачы тэксту. Два сусветныя рэкорды ў перадачы інфармацыі ўстанавіла мінчанка Ірына Цярцерская, якая ў другі раз стала мацнейшай у спаборніцтве жанчын.

Па чатыры залатыя ўзнагароды здабылі юніёры Яўген Кахно і Марына Раманенка са сталіцы. Беларусь заняла першае агульнаканданае месца, пацясніўшы Расію. Не дзіва, бо з 16 сусветных рэкордаў 9 належаць нашым спартсменам.

Ірына ПРЫМАК.

Па слядах уступнай кампаніі

У ССНУ на вяршыні папулярнасці — «архітэктура»

Міністэрства адукацыі нашай краіны падвяло вынікі ўступнай кампаніі ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Усяго прыём на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўлялі сёлета больш за 200 навучальных устаноў, у тым ліку тэхнікумы, каледжы, вучылішчы, прафесійна-тэхнічныя каледжы і вышэйшыя каледжы. Агульны конкурс на дзённую форму навучання склаў сёлета 2,4 чалавека на месца (у 2006 г.— 2,7).

Шмат гадоў запар конкурсы сярод тых, хто паступаў на аснове базавай адукацыі, былі вышэйшыя, чым сярод абітурыентаў, якія паступалі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі. Аднак сёлета сітуацыя змянілася. Калі ў 2006 годзе конкурс на аснове базавай адукацыі складаў каля 3 чалавек на месца, то ў гэтым годзе — толькі 2,3 чалавека на месца. Затое на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі конкурс, наадварот, вырас — да 2,7 чалавека на месца (летась быў 2,5). Зніжэнне конкурсу на аснове базавай адукацыі, тлумачаць у Міністэрстве адукацыі, было абумоўлена зніжэннем напалову колькасці выпускнікоў базавых школ. Сітуацыя з выпускнікамі базавых школ была ўлічана, і за кошт пераразмеркавання быў павялічаны прыём на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама прыём на завочную форму адукацыі.

На бюджэтную завочную форму навучання конкурс склаў 4,7 чалавека на месца. Больш за 30 працэнтаў навучэнцаў, якія атрымліваюць адукацыю завочна, з'яўляюцца выпускнікамі прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў і для іх завочнае навучанне з'яўляецца найбольш зручным.

Абсалютным лідарам сярод сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў стаў сёлета Мінскі архітэктурна-будаўнічы каледж, дзе на спецыяльнасці «Архітэктура» прэтэндавалі 12,3 чалавека на месца. Летась рэйтынг узначальваў Юрыдычны каледж Белдзяржуніверсітэта, дзе, дарэчы, і сёлета на адно месца на навучанне на аснове базавай адукацыі прэтэндавалі 9,8 чалавека.

Традыцыйна высокім попытам у моладзі працягваюць карыстацца спецыяльнасці «цырульніцкае мастацтва і дэкаратыўная касметыка», «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», «дызайн», «банкаўская справа і фінансы», «замежныя мовы» і медыцынскія спецыяльнасці.

Адметна, што высокія конкурсы (3—4 чалавекі на месца) назіраліся і на асобных тэхнічных спецыяльнасцях, напрыклад, на спецыяльнасці «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», «тэхналогіі машынабудавання» і «мікраэлектроніка».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пераможцы

Андрэй АРАМНАЎ:

«ХАЦЕЎ БЫЦЬ ПАДОБНЫМ ДА СУСЕДА І СТАЎ ЧЭМПІЁНАМ»

Ён моцны, дужы, але ад стомы пасля трэніровак часам не можа ўзяць у рукі больярдны кій. Аднак гэта і не так важна, бо галоўная яго зброя — штанга. Менавіта гэты снарад сенсацыйна зрабіў сёлета 19-гадовага беларуса чэмпіёнам свету сярод юніёраў і дарослых у вазе да 105 кілаграмаў. Госць нашай рубрыкі — цяжкаатлет Андрэй Арамнаў. Каб пазнаёміцца з новай «зоркай» беларускага спорту, я адправілася ў «Стайкі», дзе барысаўчанін рыхтаваўся да чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў.

Фота Вольгі ЛАСКА.

Букет у параўнанні са штангай для спартсмена бы пушынка.

— Я даўно рыхтаваўся стаць чэмпіёнам, — прызнаўся Андрэй. — Да дарослых стартаў рыхтаваўся, пачынаючы з 2005 года. Аднак з-за траўмаў былі пастаянныя няўдачы. З-за іх я не змог трапіць на галоўны старт года, дзе я мог бы змагацца за медаль. У 2005-м я зламаў руку, а ў 2006-м у мяне была траўма спіны.

— Я так разумею, што без штангі тут не абышлося... Пашкоджанні не падштурхнулі цябе забыць аб вялікіх нагрузках, цяжкай атлетыцы наогул?

— Наадварот. З кожным разам гэта толькі падзадорвала мяне і — вылілася ў добры вынік.

— Сёлета ты сабраў двайны «ўраджай» — юніёрскае і дарослае «золата». Родныя пасля такога поспеху нарэшце зразумелі, які асілак рос у іх сям'і?

— Яны заўжды сочаць за маімі поспехамі і ведаюць, што я здатны на перамогі, аднак усё ж для іх я — звычайны член сям'і. Наконт асілка заўважу, што я заўжды выдзяляюся сярод аднагодкаў сваімі фізічнымі данымі. Калі я прыйшоў на цяжкую атлетыку ў дзесяць гадоў, адразу падняў дарослы грыф, а многія мае равеснікі нават не маглі тры разы адціснуцца ад падлогі.

— Адкуль такая сіла і фізпадрыхтоўка ўзяліся? Добрыя гены паўплывалі?

— З дзяцінства я нарыхтоўваў на зіму дровы, якія калоў з ахвотай, калі мне не было чаго рабіць. Наогул я ніколі не цураўся працы. Наконт генаў магу сказаць, што мой дзед, марак, — высакарослы, бацька ў маладосці быў вельмі дужым, не худзейшым за мяне.

— Чым цяжкая атлетыка лепшая за іншыя віды спорту, чаму ты выбраў менавіта штангу, а не мяч? У Барысаве ж вельмі папулярны футбол.

— Я спрабаваў займацца рознымі відамі спорту. Сапраўды, хацеў запісацца на футбол, але мяне папрасілі больш не прыходзіць, бо ў раннім дзяцінстве я быў маленькі, нязграбны, кругленькі хлопчык. Сказалі, што футбол не мой від спорту. Пасля гэтага выпадку я год нічым не займаўся, а ў цяжкую атлетыку я трапіў, дзякуючы свайму суседу Віктару Гроду, які жыве ў маім пад'ездзе. Ён — двухразовы чэмпіён Саюза, вельмі дужы і фігурысты мужчына. Калі я дзіцем пабачыў суседа без майкі, яго мышцы так гулялі, што мне захацелася стаць такім жа высокім і дужым.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

БЕЛАРУСКУЮ МОВУ ЛЕПШ ЗА ЎСІХ ВЕДАЮЦЬ ВЫПУСКНІКІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

Магчыма, у кагосьці з абітурыентаў магло скласціся ўражанне, што пасля таго, як усе сертыфікаты ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання нарэшце знойдуць сваіх гаспадароў, у арганізатараў тэсціравання наступае працяглае зацішша. Аднак гэта меркаванне мала адпавядае рэчаіснасці.

— Пра адну з галоўных функцый цэнтралізаванага тэсціравання — ранжыраванне абітурыентаў — ведаюць усе, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Тэсты павінны ранжыраваць абітурыентаў і з гэтай задачай яны цалкам спраўляюцца. Але цэнтралізаванае тэсціраванне выконвае таксама яшчэ адну не менш важную функцыю — вызначае ўзровень падрыхтаванасці выпускнікоў асобных класаў, навучальных устаноў, гарадоў, раёнаў і рэгіёнаў. — Фактычна ў адзін дзень і ў адзін час па адных і тых жа экзаменацыйных матэрыялах правяраюць свае веды дзесяткі тысяч выпускнікоў па ўсёй краіне.

А экзаменатар, у ролі якога выступае наш інстытут, абсалютна пазбаўлены прадузятасці. Гэта ў школе адзнаку можна падкарэктаваць, каб не сапсаваць выпускніку атэстат ці агульную карціну з паспяховасцю ў школе. А на тэсціраванні — усе роўныя: школьныя «выдатнікі», «харашысты» і «сярэднячкі». Такім чынам масавы характар праверкі ведаў выпускнікоў з выкарыстаннем аднолькавых методык і агульнага інструментарыя стварае магчымасці для аб'ектыўнага аналізу спраў у адукацыі па ўсёй краіне.

Як і ў папярэднія гады, нашым інстытутам падрыхтаваны зборнікі са статыстычнымі звесткамі аб выніках цэнтралізаванага тэсціравання абітурыентаў літаральна па кожнай установе адукацыі краіны. На электронных носьбітах гэтыя матэрыялы ўжо накіраваныя ва ўсе абласныя ўпраўленні адукацыі і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама. Але нам не хацелася б, каб яны выкарыстоўваліся ў мэтах пакарання тых настаўнікаў, чые вучні набралі на тэсціраванні не вельмі высокія балы. Гэта, хутчэй, інфармацыя для роздуму, падказка, што трэба штосьці змяняць у вучэбным працэсе.

Аналізуючы паказчыкі сярэдняга бала цэнтралізаванага тэсціравання па тыпах населеных пунктаў, мы заўважылі, што другі год запар назіраюцца істотныя зрухі ў рэйтынгу школ. Так выпускнікі школ малых гарадоў па асобных дысцыплінах апярэджваюць сваіх равеснікаў як з абласных цэнтраў, так і са сталіцы. Як заўсёды ніжэйшыя паказчыкі маюць выпускнікі сельскіх школ. Аднак па беларускай, нямецкай, іспанскай мовах і геаграфіі яны дэманструюць у апошнія два гады больш высокія веды, чым гараджане.

Калі паглядзець на дасягненні асобных рэгіёнаў, то трэба адзначыць, што вельмі нядрэнныя вынікі дэманструюць штогод выпускнікі сталічных устаноў адукацыі, якія апярэджваюць сваіх равеснікаў па агульнасярэднім тэставым бале па многіх вучэбных дысцыплінах. Напрыклад, па фізіцы, матэматыцы, хіміі. Нядрэнныя вынікі ў мінчан таксама па грамадскіх дысцыплінах. Між іншым, сталічныя школьнікі пасаянна ўступаюць сваім аднагодкам па замежных мовах і геаграфіі.

Нядрэнныя вынікі дэманструюць штогод па ўсіх прадметах і жыхары Гродзеншчыны. У іх самыя высокія па краіне паказчыкі сярэдняга бала па беларускай, рускай і замежных мовах. Мяркую, што сумесная штогадовая работа ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта па дыягностыцы ведаў і прафесійнай арыентацыі выпускнікоў школ стварыла ў рэгіёне добры падмурак для якасці адукацыі і самаадукацыі будучых студэнтаў.

Трывалыя і стабільныя вынікі па прадметах лінгвістычнага цыкла з году ў год дэманструюць выпускнікі Міншчыны. Абітурыенты Віцебскай вобласці трэці год запар дэманструюць добрыя веды па «Гісторыі Беларусі». Сёлета яны вызначыліся таксама і па геаграфіі. Да таго ж два апошнія гады ў іх лепшыя па краіне вынікі па англійскай мове.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Брэсцкая вобласць знаходзіцца ў сярэдзіне рэйтынгу. А вось абітурыенты з Гомельшчыны і Магілёўшчыны па выніках чатырох апошніх гадоў знаходзяцца ў аўтсайдарах.

На думку Мікалая Фяськова, рэйтынг абласцей, які ўсталяваўся за гады правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, можа быць пакладзены ў аснову прагнозу на бліжэйшыя два-тры гады, паколькі за больш кароткі час змяніць сітуацыю і палепшыць вынікі атэстацыі выпускнікоў наўрад ці магчыма. Між іншым, трэба памятаць, што пры вызначэнні рэйтынга тэрыторый пры любым раскладзе хтосьці будзе апошнім.

— Але трэба імкнуцца да таго, каб разрыў у паказчыках паміж рэгіёнам, які ўзначальвае рэйтынг, і рэгіёнам, які яго закрывае, быў мінімальны, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сярэдні бал удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання:

Беларуская мова:

Гродзенская вобласць — 45,08
Мінская вобласць — 44,06
Брэсцкая вобласць — 42,26
Віцебская вобласць — 41,94
г. Мінск — 40,59
Магілёўская вобласць — 39,09
Гомельская вобласць — 36,64

Руская мова:

Гродзенская вобласць — 47,18
г. Мінск — 47,00
Віцебская вобласць — 45,62
Брэсцкая вобласць — 45,43
Мінская вобласць — 45,19
Гомельская вобласць — 42,43
Магілёўская вобласць — 41,83

Гісторыя Беларусі:

Віцебская вобласць — 36,91
Гродзенская вобласць — 35,98
г. Мінск — 35,60
Брэсцкая вобласць — 34,46
Мінская вобласць — 33,87
Гомельская вобласць — 32,87
Магілёўская вобласць — 33,20

Матэматыка:

г. Мінск — 34,56
Гродзенская вобласць — 33,77
Віцебская вобласць — — 33,53
Мінская вобласць — 33,21
Брэсцкая вобласць — 32,45
Магілёўская вобласць — 30,74
Гомельская вобласць — 29,97

Хімія:

г. Мінск — 47,71
Віцебская вобласць — 44,22
Гродзенская вобласць — 43,93
Брэсцкая вобласць — 43,39
Мінская вобласць — 43,19
Гомельская вобласць — 42,22
Магілёўская вобласць — 42,05

Біялогія:

Гродзенская вобласць — 48,35
Віцебская вобласць — 48,29
г. Мінск — 47,65
Мінская вобласць — 46,62
Брэсцкая вобласць — 46,03
Гомельская вобласць — 46,04
Магілёўская вобласць — 45,68

«Чалавек. Грамадства. Дзяржава»:

Гродзенская вобласць — 45,91
г. Мінск — 45,89
Віцебская вобласць — 45,49
Брэсцкая вобласць — 45,13
Гомельская вобласць — 44,52
Мінская вобласць — 44,48
Магілёўская вобласць — 44,05

Англійская мова:

Віцебская вобласць — 44,33
Гродзенская вобласць — 44,12
Брэсцкая вобласць — 42,22
г. Мінск — 41,26
Мінская вобласць — 41,83
Гомельская вобласць — 38,70
Магілёўская вобласць — 37,51

«ХАЦЕЎ БЫЦЬ ПАДОБНЫМ ДА СУСЕДА І СТАЎ ЧЭМПІЁНАМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Калі ты не стаў займацца футболам, то магчыма, з'яўляешся балельшчыкам БАТЭ? Ці часта цябе можна пабачыць на матчах?

— Не, я не хадзіў на стадыён «хварэць» за футбалістаў. Толькі аднойчы прысутнічаў на гульні... жаночай каманды «Бабруйчанка», бо мне было цікава на гэта паглядзець.

— Калі цябе цікавіць жаночы футбол, задам пытанне: хто ж выйграў сёлетні чэмпіянат свету сярод жаночых камандаў?

— Не ведаю. Тады я пайшоў на жаночы футбол, бо на той момант я якраз прыехаў з Нарвегіі, а «Бабруйчанка» сустракалася з саперніка мі з гэтай краіны. Мяне заінтрыгавала, хто ж выйграе.

— Калі ты прыйшоў у цяжкую атлетыку, што было найбольш складаным — штуршок ці рывок?

— Рывок даваўся лягчэй, бо гэта рэзкае тэхнічнае практыкаванне, а з тэхнікай я сябрую лепш. І зараз у рыўку я адчуваю сябе больш вольным, чым у штуршку, які для мяне больш цяжкі псіхалагічна.

— Цяжкая атлетыка — від спорту, дзе трэба мець сапраўды жалезныя нервы. Прыемна было бачыць, што на чэмпіянаце свету-2007 ты паказаў сябе вытрыманым спартсменам, быццам наогул не нервавауся...

— Вельмі шмат залежыць ад таго, як настроішся. Некаторыя спартсмены нястрыманыя, эмацыянальныя, а я з дзяцінства спакойны, ураўнаважаны, трымаю ўсё ў сабе, але ў патрэбны момант я магу гэта ўсё ўзарваць — стаць ў два разы мацнейшым і падняць неабходную вагу.

— Якія выпрабаванні ў тваім жыцці па цяжкасці можаш параўнаць з той вагой, што табе даводзіцца падымаць у спорце?

— На шчасце, у мяне нічога такога не здаралася. І цудоўна! Лепш не нервавацца, быць спакойным чалавекам.

— Сёлетні чэмпіянат свету праходзіў у Тайландзе. Чым цябе ўразіла гэта краіна?

— Мне былі цікавыя адносіны паміж людзьмі, якія пры сустрэчы кланяюцца адзін аднаму, вітаюцца, складваючы далоні. Гэта паказчык павагі. Там усе так рабілі і таму я, зразумела, таксама хацеў быць ветлівым.

— У якіх краінах яшчэ табе давялося пабываць і дзе асабліва спадабалася?

— На спаборніцтвах я быў у Кітаі, Славакіі, Чэхіі, Нарвегіі, Балгарыі — шмат дзе. Збор у нас праходзіў ва Украіне, а больш за ўсё мне падабаецца ў... Барысаве.

— Чаму тады вучышся ў Бабруйску?

— У Бабруйскім вучылішчы алімпійскага рэзерву створаны вельмі добрыя ўмовы. Можна адначасова вучыцца і трэніравацца, ды і гэтаму спрыяе Міхаіл Мікалаевіч Рабікоўскі, які кантралюе маё харчаванне, рэжым. Напрыклад, калі я не захачу пайсці на заняткі... (*усміхаецца*). Там усё зроблена зручна і блізка. У Бабруйск я прыязджаю на сесію, калі мяне выклікаюць вырашаць нейкія пытанні.

— Ты казаў, што быў у Кітаі. Як табе ўмовы, у якіх выступаць на Алімпіядзе-2008?

— Клімат для мяне не перашкода, калі буду добра падрыхтаваны. У выпадку майго ўдзелу ў Алімпіядзе мяне не саб'е з рытму спёка ці вільготнасць. Калі дрэнна падняў, значыць, дрэнна быў гатовы, а спісваць праблемы на іншыя прычыны — праяўленне слабасці. Калі ты моцны, то заўжды падымеш шмат.

— Што для цябе мінімальная планка на Алімпіядзе?

— Я думаю, калі ўсё складзецца, пабіць сусветны рэкорд. Да гэтага я быў гатовы і ў Тайландзе, але трэнеры мяне прыпынілі.

— Раней ты выступаў у меншай вазе (да 94 кг). Перайшоў у 105 з-за добрага апетыту, каб можна было болей есці? Ці ў новай вазе канкурэнцыя меншая?

— У вазе да 94 кг я выступаў доўгі час — з 16 гадоў. Улічваючы, што я расту, а вагу трэба прытрымліваць (гэта стала праблемай), трэнеры перавялі мяне ў новую вагу. І зрабілі правільна, бо я адразу дасягнуў добрага выніку. Канкурэнцыя ж прыкладна аднолькавая.

— Ты верыш у нейкія забабоны ў дзень спаборніцтваў?

— Не, я абсалютна не прымхлівы. Наогул не разумею людзей, якія вераць ва ўсё гэта.

— Хто ў вашай камандзе чэмпіён у більярдзе, у які гуляе каманда ў вольны ад трэніровак час у «Стайках»?

— У нас не так шмат часу, каб вызначаць чэмпіёна, ды і, здараецца, я так стамляюся на трэніроўках, што мяне больш чым на партыю не хапае.

— Дзякуй за гутарку і ўдачы табе на памосце!

Ірына ПРЫМАК.

АНКЕТА «ЗВЯЗДЫ». АНДРЭЙ АРАМНАЎ.

Мянушка. *Барысаўскі танк. Так спартсмена, які выступае ў вагавай катэгорыі да 105 кг, сталі называць у спартыўным асяроддзі пасля яго феерычных перамог.*

Захапленне. *З краін, дзе пабываў, спартсмен прывозіць манеты. Калекцыя пакуль невялікая — 15 манетак.*

Адпачынак. *Більярд.*

Мара. *Выйграць на Алімпіядзе, атрымаць вадзіцельскія правы і набыць аўтамабіль.*

Кур'ёз. *Хтосьці перад спаборніцтвамі не можа спаць ноччу з-за хваляванняў, а Андрэй кладзецца спаць пазней толькі з-за таго, што... прышывае на спартыўную форму герб нашай краіны, бо ў апошні момант заўважыў, што яго там няма. Днём з-за занятасці трэніровачным працэсам ён ніколі не паспявае прышыць герб своечасова.*

АБАРАНІЦЬ ГОНАР УЗБРОЕНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ

ПлащАРМ

Такую задачу паставілі перад удзельнікамі чацвёртых Сусветных ваенна-спартыўных гульняў у Індыі

На буйны ваенна-спартыўны форум адправіцца больш як сто беларусаў, якія выступяць у дзесяці відах спорту: гэта ваеннае пяцібор'е, гандбол, плаванне, дзюдо, бокс, кулявая стральба, вольная і грэка-рымская барацьба, лёгкая атлетыка, парашутны спорт.

Спаборніцтвы пройдуць з 12 па 21 кастрычніка. Капітанам беларускай зборнай стаў алімпійскі чэмпіён Афін па дзюдо Ігар Макараў. Днямі на цырымоніі провадаў каманды ў армейскім палацы гульнявых відаў спорту сцяг Беларусі гамяльчаніну ўручыў міністр абароны генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў. У складзе зборнай — стралок Сяргей Мартынаў, гандбалісты мінскага СКА, парашутыстка Алена Ермальчук, дзюдаіст Сяргей Шундзікаў і іншыя. Сусветныя ваенна-спартыўныя гульні пройдуць у Індыі, таму, на думку міністра спорту Беларусі Аляксандра Грыгарава, спаборніцтвы можна разглядаць і як этап падрыхтоўкі да летніх Алімпійскіх гульняў-2008, якія таксама адбудуцца ва ўсходнім рэгіёне, а значыць, удзел у турніры дапаможа змадэліраваць умовы Гульняў у Кітаі. Дарэчы, да Алімпіяды рыхтуюцца прадстаўнікі Узброеных Сіл Беларусі па 12 відах спорту (армейскія спартсмены ўжо заваявалі 16 ліцэнзій). Міністр абароны Беларусі Леанід Мальцаў ніякага медальнага плана перад спартсменамі ў пагонах не ставіў. Галоўная задача — ганарова прадставіць Узброеныя Сілы сярод амаль сотні краін свету, а ўзнагароды можна будзе падлічыць пасля вяртання беларусаў з Індыі.

Ірына ПРЫМАК.

Фота БЕЛТА.

Міністр абароны генерал-палкоўнік Леанід МАЛЬЦАЎ уручае сцяг Беларусі капітану каманды Ігару МАКАРАВУ.

НОВАЯ КАЗАРМА — ЛЕПШАЯ СЛУЖБА

Рота ганаровай варты атрымала новую казарму. Для вайскоўцаў, якія праходзяць тут тэрміновую службу, пераезд у ваенны гарадок ва Ўручы стаў не проста прыемнай, а значна большай падзеяй. Казарма з'яўляецца ўзорам, якім чынам павінны быць арганізаваны бытавыя ўмовы для салдатаў у сучаснай арміі.

Тут ёсць усё неабходнае: пральная машына, сістэма аўтаномнага водазабеспячэння, душавыя кабіны, мультымедыйная апаратура. Якасны рамонт праведзены ў кожным з пакояў. Вайскоўцы адпачываюць не на звыклых для большасці ваенных часцей двух'ярусных ложках, а на «цывільных» драўляных. Нават табурэты, якія маральна аджылі, заменены на мяккія крэслы. Ганарыцца ёсць чым:

— Рэканструкцыя ўсяго будынка, дзе зараз знаходзіцца казарма, пачалася некалькі гадоў таму. Мы стварылі ўмовы не толькі для нясення службы, але і для баўлення вольнага часу салдат. Налета плануем зрабіць спартыўную залу. Таксама цалкам ажыццявім рэканструкцыю пляца, для гэта трэба выдаткаваць каля 1,5 мільярда рублёў, — расказаў **ваенны камендант Мінскай ваеннай камендатуры палкоўнік Анатоль ГРЫЦАЎ.**

Між тым, як паведаміў карэспандэнту газеты **першы намеснік міністра абароны генерал-лейтэнант Сяргей ГУРУЛЁЎ,** распрацавана праграма, згодна з якой на працягу пяці гадоў будзе зроблена рэканструкцыя ва ўсіх (а іх больш чым 500) ваенных гарадках краіны.

— Трэба правесці рамонт і рэканструкцыю такім чынам, каб стварыць нармальныя ўмовы для праходжання службы, — падкрэсліў Сяргей Гурулёў. — Тое, што рота ганаровай варты мае зараз новае памяшканне, якое адпавядае гэтаму патрабаванню, сведчыць аб тым, што мы ўжо праводзім работу. І не толькі ў сталіцы, але і ў іншых рэгіёнах.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

КАМПАКТ-ДЫСКУ — 25!

Першы CD змяшчаў апошні альбом гурта ABBA

У гэтым годзе юбілей святкуе кампакт-дыск. Гэты музычны носьбіт з'явіўся 25 гадоў таму і адразу стаў карыстацца попытам, бо па сваіх якасцях (высокай якасці гучання і зносастойкасці) прыемна выдзяляўся на фоне вінілавых пласцінак і магнітафоннай стужкі. Сістэма лічбавага запісу была распрацавана спецыялістамі такіх фірмаў, як «Соні» і «Філіпс» пад кіраўніцтвам Петэра Крамера (спачатку кампакт-дыск быў разлічаны на стэрэафанічны запіс працягласцю 74 хвіліны, а потым — на 80 хвілін). Першым музычным альбомам, які запісалі на новы від носьбіту, стаў апошні альбом шведскай групы ABBA «The Visitors». З моманту стварэння кампакт-дыскаў іх прададзена ўжо звыш 200 мільярдаў.

Ірына АНАТАВА.

Пытальнік

Адказ з Генштаба:

даведку студэнту выдаць!

Паважаная рэдакцыя газеты «Звязда», дзякуй вам за апублікаваную ў пачатку жніўня заметку наконт змяненняў у закон аб прызыве ў армію студэнтаў, адлічаных з вышэйшых навучальных устаноў па ўласным жаданні. Вельмі многіх бацькоў і саміх студэнтаў цікавіла гэта пытанне.

Але ў адносінах да нашага сына склалася канфліктная сітуацыя. У раённым ваенкамаце нам сказалі, што яму будзе прадастаўлена адтэрміноўка ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта. Саша год таму адлічваўся з ВНУ па ўласнаму жаданню і працягваў вучобу ў Вялікабрытаніі. У жніўні ён прыехаў з Лондана і аднавіўся на бюджэтную форму навучання. Але па месцы вучобы яму пакуль не выдаюць даведку формы 029, якую ён павінен прадаставіць у ваенкамат, па прычыне таго, што няма тлумачэнняў да Указа, якія б датычылі студэнтаў, што былі адлічаны да таго, як гэты ўказ выйшаў. Загадзя вам удзячныя, калі дапаможаце нам разабрацца ў сітуацыі, што склалася.

Сям'я Шуцько, *г. Мінск.*

Ліст Алены Іосіфаўны Шуцько па пытанню прадастаўлення адтэрміноўкі ад прызыву для працягу навучання сыну Аляксандру па просьбе рэдакцыі быў разгледжаны ў галоўным арганізацыйна-мабілізацыйным упраўленні Генеральнага штаба Узброеных Сіл. Афіцыйны адказ, у тым ліку і самой заяўніцы, быў падпісаны **начальнікам гэтага ўпраўлення—намеснікам начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл генерал-маёрам І. ГЛОДАМ.**

«Па сутнасці звароту паведамляю, што, у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» ў рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2007 года, іх сын мае права на адтэрміноўку ад прызыву для працягу адукацыі, паколькі ён адлічваўся з установы адукацыі па ўласным жаданні. Грамадзянам, адлічаным за парушэнне дысцыпліны, непаспяховасць з установы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, адтэрміноўка ад прызыву для працягу адукацыі не прадастаўляецца.

Установа адукацыі, у якой вучыцца Аляксандр Шуцько, абавязана выдаць яму даведку з месца вучобы па форме № 29 для прадастаўлення адтэрміноўкі ад прызыву для працягу адукацыі прызыўной камісіяй Ленінскага раёна г. Мінска».

«НЕ ВЕДАЮ ЧАЛАВЕКА, ЯКІ Б РАЗБАГАЦЕЎ НА ГАЛУБАХ»

«Прыязджай, не пашкадуеш, — запрашае мяне на галубіны кірмаш галубавод-селекцыянер з Чэрвеня Уладзімір Залескі. — Я пазнаёмлю цябе з калегамі з усёй Беларусі. Ды і на галубіны «букет» паглядзіш (падмаргвае) — галубы ж, як кветкі, не толькі адчувальныя, але і розныя».

ПОЎНАСЦЮ ГЛАДКАЯ — ТОЛЬКІ Ў ПЕЧЫ АЛАДКА

Гэтым летам Міністэрства юстыцыі дало дабро на рэгістрацыю новага грамадскага аб'яднання — «Аматары галубоў і дэкаратыўных птушак». Нялёгка ўзводзіць новы палац на руінах старога (ранейшая сістэма, паводле слоў галубаводаў, мела шмат хібаў). Але малады і ініцыятыўны старшыня Фёдар Раковіч, пераканалася, настроены па-баявому.

— Нас ведаюць паўсюль. Беларускія галубаводы ўдзельнічаюць у святах не толькі рэспубліканскага і гарадскога значэння (выпускаем галубоў перад трыбунай Прэзідэнта, на вяселлі маладыя часта заказваюць сімвал міру і кахання — голуба і галубку — каб кінуць іх у неба). У дадатак да гэтага мы прадстаўляем нашу краіну і на міжнародным узроўні. У якасці экспертаў ездзілі ў Літву, Польшчу, Маскву. У пачатку верасня дэманстравалі сваіх гадаванцаў на кіеўскім кірмашы.

Але поўнасцю гладкай можа быць толькі ў печы аладка. І ў аматараў галубоў ёсць свае праблемы. У першую чаргу, яны звязаны з ветэрынарыяй.

— Амерыканскія вучоныя даследавалі галубоў на птушыны грып. Ёсць даныя, што калі гэтыя птушкі і з'яўляюцца пераносчыкамі грыпу (небяспечнага для чалавека штама), то ў такой малой колькасці, што не могуць заразіць і кураня. А ў нас звычайна галубаводаў ставяць у адзін шэраг з людзьмі, якія трымаюць курэй... Несправядліва.

Акрамя гэтага, у Беларусі няма медыкаментаў спецыяльна для галубоў. Для курэй і гусей выпускаюць вакцыну, а да галубоў нікому і справы няма. Усё гэта стаіць на перашкодзе пры вывазе птушак за мяжу.

Маюцца праблемы і з рынкам. Вось, да прыкладу, пайшоў дождж. Людзям даводзіцца стаяць пад адкрытым небам, бо няма навесаў. Але, ведаеце, калегі рады, што наогул маюць магчымасць выстаўляць сваіх гадаванцаў тут, на Ждановічах.

«КОЛЬКІ ПРАДАЎ, СТОЛЬКІ КУПІЎ. ЯКІ Ж ГЭТА БІЗНЭС?»

Нядзельнай раніцай злавіць маршрутку на Ждановічы — не лапаць сплесці. Адна, другая, трэцяя — маланкай мільгалі перапоўненыя жоўтыя міні-аўтобусы перад вачыма. Чацвёртая пад'ехала і спынілася. Нарэшце мне пашчасціла. Сорак хвілін — і я на месцы.

Пудзелі, мопсы, таксы, персідскія і сіямскія каты... Жанчына, а перад ёй пачак з прыгожымі, але не пародзістымі коцікамі. На пачку надпіс — дару. «Вось хачу аддаць у добрыя рукі. Бо сама не ў стане выгадаваць іх», — дзеліцца сваім горам кабета.

Памятаю, чытала, што раней самым лепшым падарункам для імператрыцы была пара галубоў. Цікава, ці прынята зараз у асяродку галубаводаў рабіць адзін аднаму галубіныя падарункі? Тут як манна нябесная з'явілася дзяўчынка з маці ў суправаджэнні Фёдара Раковіча. І адказ на пытанні быў у кішэні.

— Вова, падары дзяўчынцы парачку луганскіх, — звяртаецца Фёдар да Уладзіміра Залескага.

Галубавод з Чэрвеня не раздумваючы дастае з клеткі дваіх дэкаратыўных беласнежных галубоў. Перадае новай гаспадыні і дае наказ берагчы іх.

— Ганулька, толькі ты дзядзю дай хоць сто рублёў. Гэта каб птушка не перавялася, — пасвячае ў сакрэты аматараў юную галубятніцу Фёдар. Як высветлілася, Ганна вучыцца ў 10-м класе. Прыехала з Віцебска разам з маці на цягніку спецыяльна, каб набыць сяброў для сваіх выхаванцаў.

— Жывуць галубы ў мяне на гарышчы. Іх больш за два дзесяткі. Калі мне было 13, маці прынесла хворага голуба дадому. Я яго даглядала. На жаль, ён не выжыў. Але з таго часу, вось ужо тры гады я разводжу галубоў.

— Людзі смяюцца, не разумеюць, — уступае ў размову маці. — Ганулька зараз нават стараецца нікому не гаварыць пра сваё захапленне.

Віцебская галубятніца паехала дадому шчаслівая. І нядзіўна: у кошыку пяць галубоў.

— Аб такіх прыгожых і марыць не магла, — усміхаецца дзяўчынка.

Разам з Ганнай і яе маці на цягніку прыехаў галубавод са стажам. Пасля доўгіх разлікаў выпаліў: «Вось ужо 61 год займаюся галубамі. Без іх жыцця не ўяўляю».

Калі спытала пра галубіны бізнэс, дзядок рассмяяўся: «Які ж тут бізнэс? Можа ў Маскве ці Нямеччыне, але не ў нас. Я вось, мяркуй сама, тузін галубоў сёння прадаў, столькі ж купіў».

Паводле слоў галубаводаў, у Беларусі самы мінімальны кошт на галубоў з усіх постсавецкіх краін. Пару можна нават за дзесяць тысяч беларускіх рублёў купіць. Але добрыя галубы каштуюць дорага...

— Атрымліваецца на галубах можна зарабіць неблагія грошы?..

— Я не ведаю чалавека, які б разбагацеў на галубах, — адказвае Фёдар Раковіч. — Калі гаварыць пра грошы, то аптымальным варыянтам з'яўляецца спартыўнае галубаводства. На птушак людзі ставяць стаўкі, як на коней. У Казані летась разыгрывалася машына, у Вільнюсе, Маскве, Кіеве — грошы. Самы буйны галубадром знаходзіцца ў Паўднёвай Афрыцы. Спаборніцтвы паміж хуткасныя галубамі праводзяцца два разы на год — вясной і ў пачатку лета паміж старымі галубамі, а ў канцы лета паміж маладымі. На галубадроме на галубоў надзяваюцца кантролькі, якіх гаспадар не бачыць. Навігатар адбівае адлегласць і шляхам праграмы адбіваецца хуткасць спартсмена. Такім чынам вызначаецца чэмпіён.

А ТАДЫ — ФУТБОЛ ДЫ ГАЛУБЫ

Сярэдні ўзрост галубавода — 45—50 гадоў. Гэта людзі з розных гарадоў і вёсак рэспублікі, з рознымі лёсамі, з рознымі прафесіямі. Амаль усіх лёс звязаў з галубамі выпадкова. Але трывала.

«Прыляцеў галубок на кухню, сеў на падаконнік і пачаў буркаваць. Маці была невідушчай, таму паклікала мяне, сямігадовага, каб паглядзеў, што за няпрошаны госць». «Сябар з'ядзжаў на заробкі. А галубоў не было на каго пакінуць. Папрасіў месяц пакарміць. Вось і да гэтага часу кармлю (*смяецца*)».

Сярод мужчын прыкмеціла кабету. Убачыўшы здзіўленне ў маіх вачах, яна ўсміхнулася і развеяла мае сумненні:

— Жанчына-галубавод — нязвыклая з'ява? Разумею. Але з любога правіла маюцца выключэнні. Ведаеце, ёсць такая парода галубоў «Мінскія бярозавыя». Дык яе менавіта жанчына і вывела. Даўно разводжу гэтых птушак. Галубы — аддушына ў жыцці. Падымаешся да іх — і любая непрыемнасць, якая да гэтага не давала спакою, забываецца.

Побач з жанчынай размаўляе са сваім крылатым сябрам галубавод, які прыехаў з дачкой з-пад Барысава.

— Што прывяло вас на кірмаш? — пытаюся.

— Кірмаш — цудоўная магчымасць сустрэцца з такімі ж «хворымі на галубоў» (*усміхаецца*), як сам. Што для мяне галубы? Цяжка патлумачыць, гэта можна толькі адчуць. Нехта ходзіць у спартыўную залу, нехта п'е спіртное, нехта гуляе, нехта трымае сабак. А я, пры магчымасці, нясуся за тысячы кіламетраў, каб купіць аднаго голуба.

На кірмашы галубаводы прынялі мяне за сваю. Расказвалі гісторыі пра галубоў, давалі рэкамендацыі па догляду, раілі, дзе танней можна набыць корм, і перасцерагалі, што галубоў нельга перакормліваць, бо яны, як і людзі, схільны да атлусцення. «Ну, бывай, галубятніца», — гаварылі яны мне на развітанне і ляпалі па плячы.

Кірмаш скончыўся, аматары са сваімі любімцамі паціху пачалі разыходзіцца. А я пра сябе парадавалася за іх. Мець захапленне, без якога немагчыма ўявіць жыццё, гэта мара кожнага чалавека. А ў галубаводаў яна яшчэ і з крыламі....

Надзея ДРЫЛА.
Фота аўтара.

А ВЫ ВЕДАЛІ, ШТО...

- *У XVI стагоддзі англійскі кароль Георг Першы абвясціў увесь галубіны памёт уласнасцю кароны. У тыя часы гэты прадукт жыццядзейнасці птушкі выкарыстоўваўся ў вытворчасці пораху;*
- *Паштовыя галубы лічацца самымі эфектыўнымі ўдзельнікамі Другой сусветнай вайны.*
- *98 працэнтаў іх місій былі паспяховымі — часта коштам жыцця птушкі. За час вайны галубы былі амаль поўнасцю знішчаны акупантамі. Паляцыя аднавілася толькі ў сярэдзіне 1950-х гадоў;*
- *Старажытны Вавілон, у якім царыца Семіраміда пабудавала адно з цудаў свету — вісячыя сады — быў горадам галубоў. Паводле легенды, сама Семіраміда аднойчы ператварылася ў галубку і пакінула горад;*
- *У часы кантынентальнай блакады, якую арганізаваў англічанам Напалеон, галубоў выкарыстоўвалі як кантрабандыстаў. Пад крыламі паштары пераносілі з Англіі ў Францыю каштоўныя камяні;*
- *У англійскім горадзе Плімуце паштары транспартуюць з мясцовай бальніцы ў лабараторыю, якая знаходзіцца на адлегласці трох кіламетраў ад бальніцы, прабіркі з крывёю, якую ўзялі на аналіз. Галубы робяць гэта ў два разы хутчэй, чым аўтамабілі;*
- *У вялікіх гарадах, дзе на вуліцах часта здараюцца заторы, яшчэ да вынаходніцтва мабільных тэлефонаў, для перадачы тэрміновай інфармацыі выкарыстоўвалі паштовых галубоў. Агенцтва «Рэйтэр» з сярэдзіны мінулага стагоддзя паспяхова выкарыстоўвала галубіную пошту.*

Аграрны тэхнічны ўніверсітэт як лепшае прадпрыемства Еўропы

На Оксфардскім саміце лідараў бізнэсу, адукацыі, навукі і мастацтва Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт атрымаў дзве міжнародныя ўзнагароды — за дынамічнае развіццё, забеспячэнне еўрапейскай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў «Лепшае прадпрыемства Еўропы» і за вялікі асабісты ўклад рэктара ўстановы Мікалая Казараўца ў развіццё грамадства «Імя Сакрата».

Увогуле ўзнагароджванне адбывалася ў пяці намінацыях: «Якасць еўрапейскай адукацыі», «Лепшае прадпрыемства Еўропы», «Імя Сакрата

для лідараў адукацыі і навукі XXI стагоддзя», «Лідар у бізнэсе» і «Лідар у мастацтве». Удзельнікамі мерапрыемства сталі 120 чалавек з 23 краін, у тым ліку Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Расіі, Украіны, Казахстана, Грузіі, Арменіі, Азербайджана і іншых.

Еўрапейскія краіны заснавалі «лідарскі» саміт больш як 10 гадоў таму, але беларусы ўзялі ў ім удзел упершыню. І не проста паўдзельнічалі, а прыехалі адразу з дзвюма ўзнагародамі. Штогод у Лондане, а ў апошнія гады ў Оксфардзе разглядаюцца канкрэтныя праблемы, якія маюць дачыненне да развіцця еўрапейскай садружнасці. Сёлета, напрыклад, разглядаліся пытанні бізнэсу ў адукацыі, ролі навукі ў энергетычнай бяспецы краін Еўропы і павышэння якасці адукацыйнага працэсу ў вышэйшых навучальных установах. Рэктар БДАТУ, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалай Казаравец выступіў з паведамленнем «Сістэма аграрнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь».

— Актуальныя пытанні ўдасканалення бізнэсу, адукацыі, навукі і мастацтва ў краінах еўрапейскай садружнасці разглядае Еўрапейская бізнэс-асамблея, — расказвае Мікалай Уладзіміравіч. — Яна праводзіць конкурсны адбор прадпрыемстваў, якія дынамічна развіваюцца па сваіх накірунках і забяспечваюць якасць паводле пэўных стандартаў. Летась наш універсітэт наведала прадстаўнік асамблеі — Марыя Кадлечыкава, кіраўнік рэгіянальнага цэнтра еўрапейскай садружнасці. Яна азнаёмілася і з калектывам, і з матэрыяльна-тэхнічнай базай...

Варта нагадаць, што аграрны тэхнічны ўніверсітэт сёння — гэта 9600 студэнтаў, 3870 слухачоў інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, 1,5 тысячы выкладчыкаў і абслуговага персаналу, што сведчыць аб статусе сярэдняй еўрапейскай вышэйшай навучальнай установы. Яшчэ тры гады таму ва ўніверсітэце навучаліся каля чатырох тысяч студэнтаў, працавала крыху больш за адну тысячу выкладчыкаў і абслуговага персаналу, замест цяперашніх васьмі факультэтаў было толькі шэсць, а інстытута павышэння кваліфікацыі не было ўвогуле.

Універсітэт забяспечвае комплексную трохузроўневую падрыхтоўку — кадраў сярэдняга спецыяльнага звяна праз шэсць каледжаў, вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі. 51 працэнт выкладчыкаў мае вучоную ступень, прычым звыш 10 працэнтаў — дактары навук, прафесары. Пяць чалавек — акадэмікі, члены-карэспандэнты.

Абсалютная большасць вучэбных аўдыторый аснашчана сучаснай мэбляй. У бібліятэцы размяшчаецца зала электронных падручнікаў. Лакальная камп'ютарная сетка аб'ядноўвае бібліятэку, інтэрнаты. Ёсць студэнцкае радыё і тэлебачанне.

«У нас зараз навучаецца 74 замежныя студэнты з 12 краін свету, — удакладняе Мікалай Казаравец. — Мы вядзём сур'ёзную работу па прыцягненню замежных студэнтаў. Міжнародныя ўзнагароды дазваляюць у гэтым сэнсе шырока рэкламаваць свае дасягненні, паказваць, што мы здольны забяспечыць і якасць адукацыі, і камфортныя ўмовы пражывання».

Святлана БАРЫСЕНКА.

Muz-news

ВЫХАД З «ЦЫГАНАЧКАЙ»

На беларускай сцэне з'явіўся новы артыст, які паспрабуе гэтую самую сцэну заваяваць. Здзейсніць свае намеры хлопец з гучным імем Віктар Беруці разлічвае з дапамогай прадзюсарскага цэнтра «NonStopRecords».



Што вядома пра выканаўцу? Выхоўваўся ён на італьянскіх мелодыях, асабліву перавагу аддаючы Тота Кутуньо і Раберціна Ларэці. Але гэтае захапленне не перашкодзіла Віктару з 8 гадоў удзельнічаць у ансамблі зусім іншага накірунку — цыганскім калектыве «Тэрнэ Бэрша». Браў удзел і заваёўваў першыя месцы ў праектах «Усе мы родам з дзяцінства», «Залатая падкова», «Сузор'е надзей», «Ранішняя зорка» (Расія), а таксама ў конкурсах «Зорны дыліжанс» і Польскім міжнародным фестывалі дзіцячай песні. Скончыў музычную школу па класе піяніна і акадэмічных спевах. Пры тым малады чалавек даволі паспяхова займаецца боксам і плаваннем.

Пакарыць беларускую публіку Віктар збіраецца не «з нуля» — нядаўна выканаўца зняўся ў кліпе на песню «Ведаю» (рэжысёр Павел Пунтус), і ролік з чарговымі разважаннямі на тэму непадзеленага кахання ўжо запушчаны ў ратацыю. Да пачатку 2008 года плануецца выпуск дэбютнага альбома.

ПЕСНЯ ДЛЯ СЯБРА

Адзін з найбольш вядомых «альтэрнатыўшчыкаў» беларускай сцэны, музыкант Атмараві, знаходзіцца ў Германіі, працягваючы работу над сваім трэцім акустычным альбомам. Але і на радзіму перыядычна вяртаецца — напрыклад, канцэртная прэм'ера адной з песень будучага альбома адбудзецца ў Мінску 3 лістапада.

«Песня называецца «Не спяшайся», — расказвае Атмараві. — Яна была напісана зусім нядаўна пад уплывам трагічных падзей: у кампаніі маіх мінскіх сяброў адбыўся няшчасны выпадак, пры купанні адзін з хлопцаў, Віталь, атрымаў цяжкую траўму і доўгі час знаходзіўся ў рэанімацыі, а зараз чакае складанай аперацыі. Сябры імкнуцца неяк дапамагчы — у «Жывым Журнале» стварылі суполку «Мы з табой», куды накіроўваюць словы падтрымкі і любові да пацярпелага сябра. А ў мяне нарадзілася песня — аб тым, што часам уся жыццёвая мітусня адыходзіць на другі план і адкрываецца штосьці сапраўды важнае, толькі, на жаль, гэта разуменне часта прыходзіць разам з няшчасцем. Віталю песня спадабалася, і я ад усёй душы жадаю яму хутчэйшага выздараўлення».

Як стала вядома, акрамя акустычнага альбома Атмараві плануе напрыканцы восені перавыдаць пласцінку «На провадзе», куды трапіць адна новая песня «Сонца», і яшчэ дзве кампазіцыі ў свежых апрацоўках. Пачуць іх, верагодна, удасца на канцэртах выканаўцы — з 3 лістапада ў Мінску, 11 — у Магілёве, 17 і 18 — у Санкт-Пецярбургу, 1—2 снежня — на гітарным фестывалі ў Жлобіне.

ХТО НЯСЕЦЦА ЗА МЕЖЫ

Напрыканцы верасня Аляксандр Саладуха выступіў у Віцебскім Летнім амфітэатры, дзе пры аншлагу прайшоў 100-ы ў рамках тура па Беларусі сольны канцэрт. Гэтае шоў рыхтавалася больш за месяц, але, па прызнанні артыста, яно таго каштавала. У праграме «Сотні кіламетраў да кахання» таксама прынялі ўдзел спявачка Вольга Драздова і сыны Аляксандра Саладухі, Саша і Антон. Плюс, натуральна, некалькі тысяч гледачоў.

Кульмінацыяй вечара стала песня пра вінаград, але не засталіся без увагі і іншыя хіты спевака — напрыклад, вядомы з адбору на «Еўрабачанне» «Take it easy guy» публіка прызнала самай завадной песняй, а «Чужую мілую» — любімай некалькімі пакаленнямі слухачоў; нездарма яе падпявала хорам практычна ўся зала!

Падводзячы вынікі 20-гадовай творчай дзейнасці, Аляксандр Саладуха падзяліўся, што ў Беларусі, паводле яго ўласных адчуванняў, дасягнуў «столі», і зараз трэба рухацца ў іншых накірунках: «Адчуваю, што цяпер трэба несці сябе туды — у Расію, ва Украіну...».

БАЦЬКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

7 кастрычніка ў канцэртнай зале «Мінск» ВІА «Харлі» прэзентуе сваю сольную праграму «Любоў — імя тваё». На канцэрце прагучаць песні з аднайменнага альбома, што быў выдадзены гэтай вясной, а таксама найбольш любімыя слухачамі хіты — «Ніадкуль цуд», «Снежань», «Купаліначка», «Любоў-пурга», «Добрыя людзі» і г.д.

Напярэдадні канцэрта амаль што містычным чынам з афішных тумбаў пачалі знікаць афішы гурта — прычым ні супрацоўнікі КЗ «Мінск», ні самі музыканты не могуць патлумачыць, хто ж гэта «Харлі» так не любіць (ці, наадварот, любіць занадта). Зрэшты, калектыў сцвярджае, што выступленне ўсё адно адбудзецца пры любым надвор'і, з афішамі або без іх, галоўнае — з пазітыўным настроем.

«Мы разлічваем, што канцэрт не стане банальным выступленнем калектыву, — разважае лідар гурта Жэня Чалышаў. — Дзеля гэтага прадумваем форму падачы. Натуральна, я разумею, што малая зала абмежавана ў прасторы і там не разгарнуць маштабнае шоў, але хочацца чымсьці здзівіць публіку». Адну з прыдумак музыкантам, напрыклад, падказаў фан-клуб гурта. Падчас выканання песні «Добрыя людзі», якую Чалышаў прысвяціў сваім бацькам, на вялікім экране будуць дэманстравацца фатаграфіі бацькоў тых людзей, каму цікавая творчасць «Харлі». 5 кастрычніка — апошні дзень, калі на адрас viaharli@viaharli.com прымаюцца сямейныя фота ад усіх ахвотных — зразумела, пры ўмове добрай якасці здымкаў.

САМА САБЕ РЭЖЫСЁР

